С. І. Шэйпа, Г. М. Разанава

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# ШЧАСЛІВЫ БЕЛАРУСАМ ЗВАЦЦА

## 5–9 класы

## ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

С. І. Шэйпа, Г. М. Разанава

ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

# ШЧАСЛІВЫ БЕЛАРУСАМ ЗВАЦЦА

## 5–9 класы

## ДЫДАКТЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання**

*Рэкамендавана навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Вучэбнае электроннае выданне

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2023

УДК [39+008](=161.3)(075.3)
ББК 63.5(4Беи)я721

Р э ц е н з е н т ы:

старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук *М. А. Шатарава*;

раённае метадычнае аб'яднанне настаўнікаў мастацтва (настаўнік мастацтва вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Слоніма» *Н. В. Лашчэўская*)

Дадзены дапаможнік уваходзіць у вучэбна-метадычны комплекс па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці «Шчаслівы беларусам звацца», 5–9 класы.

Вучэбна-метадычны комплекс факультатыўных заняткаў распрацаваны ў Нацыянальным інстытуце адукацыі ў межах выканання задання ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» і ўключаны ў зводны план выпуску (укаранення) зноў асвоенай прадукцыі (інавацый) па ГНТП «Функцыянальная адукаванасць» на 2021–2025 гг., зацверджаны Міністэрствам адукацыі ад 17.02.2021. Мова выдання — беларуская.

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*

Падпісана да карыстання 2023
Размешчана на сайце 2023

Аб'ем выдання 4153 КБ
Сістэмныя патрабаванні: ПЗ для прагляду дакументаў у фармаце pdf

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

**ISBN 978-985-893-557-3**

© Шэйпа С. І., Разанава Г. М., 2023
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2023

# Змест


Уводзіны ........ 5

**1-ы ГОД НАВУЧАННЯ** ........ 7

МОДУЛЬ 1. СВАЯ ХАТКА — ЯК РОДНАЯ МАТКА ........ 8

МОДУЛЬ 2. НАШУ ДАЧКУ ПАЗНАЮЦЬ І Ў АНДАРАЧКУ ........ 16

МОДУЛЬ 3. ШТО ХУТАРОК — ТО ГАВАРОК, ШТО СЯЛЬЦО — ТО СЛАЎЦО ........ 31

МОДУЛЬ 4. СМАЧНА БЫЛО, ДЫ БЛІЗКА ДНО ........ 36

МОДУЛЬ 5. НА ЎСЁ СВАЕ ПЕСНІ: НА ВЯСЕЛЛІ ВЯСЕЛЬНЫЯ, А НА ХРЫСЦІНАХ ХРЫСЦІННЫЯ ........ 41

**2-і ГОД НАВУЧАННЯ** ........ 49

МОДУЛЬ 6. ДОБРАЯ ДАРОГА — КАРАЦЕЙШЫ ШЛЯХ ........ 50

МОДУЛЬ 7. ДОБРАЯ СЛАВА ДАЛЁКА ЧУВАЦЬ ........ 58

МОДУЛЬ 8. ЧАЛАВЕК ЖЫВЕ ВЕК, А ДОБРАЕ ДЗЕЛА — ДВА ........ 63

МОДУЛЬ 9. НА ДОБРАЙ ЗЯМЛІ ДОБРАЯ НАДЗЕЯ ........ 71

*Спіс выкарыстаных крыніц* ........ 79

*Спіс малюнкаў* ........ 81

# УВОДЗІНЫ

Няма нічога больш цікавага,
як вывучэнне гісторыі мясцовасці,
з якой у нас што-небудзь звязана.

*Юзаф Крашэўскі.*

На факультатыўных занятках «Шчаслівы беларусам звацца» мы прапануем вам адчуць сябе сапраўднымі даследчыкамі гісторыі і культуры свайго роднага краю, іх летапісцамі і стваральнікамі.

На ўроках беларускай і рускай моў, беларускай і рускай літаратур вам ужо даводзілася сустракацца са шматлікімі тэкстамі, вывучаць асаблівасці публіцыстычных і навуковых тэкстаў, даследаваць адметнасці дыялектнай мовы, параўноўваць яе ўзоры з прыкладамі літаратурнай мовы. Акрамя таго, вы назапасілі веды па сусветнай гісторыі, гісторыі і геаграфіі Беларусі, неабходныя не толькі для аналізу тэкстаў разнастайных фарматаў і відаў, але і для самастойнага спасціжэння твораў розных відаў мастацтва. А ўрокі «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» падаравалі вам незабыўныя ўражанні ад знаёмства з таленавітымі замежнымі і айчыннымі творамі выяўленчага, тэатральнага і экраннага, музычнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў. Больш за тое, на занятках «Працоўнае навучанне» вы атрымалі ўяўленне пра стравы беларускай нацыянальнай кухні і іх унікальнасць, пра мастацтва гатавання ежы. А некаторыя са страў, напрыклад, яечню-калатуху і драчону з яблыкамі, зацірку і крупнік, вы нават гатавалі і спрабавалі.

Разам з тым немагчыма абмежавацца толькі той інфармацыяй, якую вы атрымалі ад настаўнікаў падчас урокаў мовы і літаратуры, мастацтва і гісторыі, геаграфіі і працоўнага навучання. Таму, з аднаго боку, гэтыя факультатыўныя заняткі па краязнаўству дапамогуць падагуліць і сістэматызаваць ужо набытыя веды, а таксама замацаваць і паглыбіць уменні працаваць з разнастайнымі інфарматыўнымі крыніцамі. З другога боку, вы набудзеце новыя веды па гісторыі і культуры, даведаецеся пра звычаі і традыцыі свайго краю, пазнаёміцеся з выдатнымі асобамі і значнымі градаўтваральнымі прамысловымі прадпрыемствамі сваёй мясцовасці і нават спрагназуеце сваю будучыню.

Разам са сваімі сябрамі вы абавязкова навучыцеся арыентавацца ва ўмоўных абазначэннях чарцяжоў і схем гістарычных збудаванняў і, верагодна, будзеце першымі, хто склаў пашпарт культурнага аб’екта мясцовасці. У вас з’явіцца рэальная магчымасць стварыць калекцыю сучаснага адзення, адметнасцю якой будуць аздобленыя нацыянальнымі элементамі сукенкі або кашулі, камізэлькі або світары, хусткі або торбы.

Безумоўна «смачным» стане праект па гатаванні шыкоўнай стравы, рэцэптам якой падзеліцеся са сваімі сябрамі. Вы маеце магчымасць паўдзельнічаць

у народным абрадзе, які ладзілі вашы продкі, і ён умомант захопіць сваёй надзвычайнай глыбінёй і прыгажосцю. Вы абавязкова пройдзіце сцежкамі вашага знакамітага земляка і адчуеце тое, што натхняла яго на творчыя справы. Потым, па жаданні, зможаце напісаць у газету серыю нататак і падзяліцца сваімі ўражаннямі ад знаёмства з выключнай духоўнай сілай і моцай таленту гэтага выдатнага чалавека.

Магчыма, больш цікавай вам падасца работа па вывучэнні тэхналагічных працэсаў вытворчасці мясцовага прадпрыемства, выяўленні праблем у яго функцыянаванні. А можа, найбольш прывабным стане праект па мадэляванні свету будучыні і падрыхтоўцы прагнозаў развіцця мясцовасці ў розных сферах, якія дасць магчымасць зазірнуць у будучыню і ўбачыць сваю сям’ю і сяброў, прафесію і дом ужо праз якіх-небудзь 25 гадоў.

Мы спадзяемся, што арганізаваная ў межах факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца» праектная дзейнасць дапаможа рэалізаваць не толькі ваш даследчы, але і творчы патэнцыял, а таксама сцвердзіць сябе не толькі як аўтара сапраўднага даследавання, але і як сааўтара беларускай гісторыі і культуры.

*З пажаданнямі даследчага і творчага плёну,*
*аўтары*

# 1-ы ГОД НАВУЧАННЯ

## Уводзіны ў праектную дзейнасць

Праектная дзейнасць: паняцце праектнай і вучэбна-даследчай дзейнасці. Пошук інфармацыі. Праект. Прэзентацыя.

Тэматычны агляд праектаў факультатыўных заняткаў «Шчаслівы беларусам звацца».

# Модуль 1. Свая хатка — як родная матка

Стары мураваны дом: становіцца ён з гадамі усё больш адметны, усё больш сапраўдны і ўсё больш жывы.

*Алесь Разанаў.*

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Як вы разумееце словазлучэнне «гістарычны будынак»?
- Якія збудаванні можна аднесці да гістарычных будынкаў?
- Назавіце гістарычныя будынкі, якія вы сустракалі ў Беларусі.
- Падбярыце да словазлучэння «гістарычны будынак» адпаведныя словы і выразы, напрыклад, «велічная прыгажосць», «глыбокая даўніна»...

**Заданне 1**

1. Вызначце характарыстыкі, па якіх можна меркаваць пра тое, што перад вамі знаходзіцца гістарычны будынак.

2. З прапанаваных малюнкаў (мал. 1–8) выберыце тыя, што адпавядаюць вашым уяўленням пра гістарычны будынак.



*Мал. 1.* Міхаіл Басалыга. Мірскі замак



*Мал. 2.* Віктар Сташчанюк. Дом, у якім жыў С. Манюшка ў Мінску



*Мал. 3.* Музей Максіма Багдановіча ў Гродна



*Мал. 4.* Ветраны млын у в. Мольча Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці



*Мал. 5.* Музей творчасці «Бяздзежскі фартушок» (в. Бяздзеж)



*Мал. 6.* Касцёл узвышэння св. Крыжа ў Гродна



*Мал. 7.* Былы хіміка-фармацэўтычны завод у Партызанску (Расія)



*Мал. 8.* Сядзіба Манюшкаў у Смілавічах

3. Дайце другую назву выбраным малюнкам гістарычных збудаванняў.
4. Дапоўніце калекцыю гістарычных малюнкаў.

— Навошта трэба захоўваць старажытныя гістарычныя будынкі?

— Што робіць наша дзяржава, каб захаваць гістарычныя будынкі? Ці можам мы што-небудзь зрабіць для іх захавання?

*Падагульненне*

— Што дае нам знаёмства з гістарычнымі будынкамі мясцовасці?

— Вызначце, якому гістарычнаму збудаванню будзе прысвечаны ваш праект. Растлумачце свой выбар.

**II. Збор інфармацыі пра архітэктуру, дойлідства, быт, прадметы хатняга ўжытку мясцовасці.**

— Якую з крыніц вы выберацe, каб знайсці звесткі пра гістарычныя будынкі?


1. Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 1993. — 620 с.
2. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2004.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. — Мінск : Беларуская савецкая энцыклапедыя, 1984–1988.
4. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. — Минск : Издательство Белорусского государственного университета, 1974. — 447 с.

5. Памятники народной архитектуры и быта Белоруссии : метод. пособие по выявлению и собиранию / Белорусское добровольное общество охраны памятников истории и культуры. — Минск : Полымя, 1979. — 118, [2] с.
6. Помнікі этнаграфіі: методыка выяўлення, апісання і збірання / Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. — Мінск : Навука і тэхніка, 1981. — 149, [1] с.
7. Рогалеў, А. Ф. Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі) / А. Ф. Рогалеў. — Гомель : Барк, 2008. — 216 с.
8. Габрусь, Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына : выяўленчы матэрыял / Т. В. Габрусь. — Мінск : Беларуская навука, 2014. — 483 с.
9. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 1989. — 575 с.
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 1993–2004.

**Заданне 2**

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння вашага праекта пра гістарычнае збудаванне.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: пашпарт і схема (план) гістарычнага збудавання мясцовасці.**

**Заданне 3**

1. Прачытайце тэкст. Што значыць для беларуса родная хата?

У нас не было пераносных чумаў, бо мы аселы народ і вельмі любім раз і назаўсёды выбранае месца: як пабудаваўся — дык навечна!

Мы лясныя людзі, у нас вельмі шмат дрэў, таму свае хаты беларусы спрадвеку будавалі толькі з дрэва, у асноўным з сасны і елкі. Крыху дадавалі дуба — дубовыя бярвенні ішлі на падруб, клаліся на ўкапаныя ў зямлю дубовыя штандары, былі першымі вянцамі нашых хат. Дуб стагоддзямі не гніе, а хата павінна стаяць вечна.

Мы ведалі: у хаце будзем жыць мы, нашы дзеці, нашы ўнукі, а то — і дай Бог чутае ды ўбачыць! — нашы праўнукі.

Таму заканчэнне будаўніцтва новай хаты заўсёды было найвялікшым святам для ўсіх. На ўлазіны мы апраналіся ў самае чыстае адзенне — як на Вялікдзень. Уваходзілі ў новую хату — і адразу ж клікалі з сабою Хатнічка: ён, руплівы і дбайны, дапамагаў нам наладзіць у нашай святліцы лад і парадак.

Радаваліся новай хаце не толькі мы, людзі, а і ўсё, што было побач з намі, — куры, цяляты, ягняты, парасяты. Быццам і яны ведалі, што ўзімку, як прыцісనуць марозы, наша хата і для іх стане такой жа гасціннай і ўтульнай, як і для нас. Няхай сабе ў падпечны, няхай сабе ў парозе, але ж ім будзе цёпла і ўлежна ўсю зіму.

У нашых хатах спрадвеку жылі калыскі і лаўкі, цвыркуны і качэргі, сталы і кросны, збанкі і цэбры, жорны і абразы. Ходзікі жылі, скацёркі жылі, абрусы жылі, ручнікі жылі — імі мы прыбіраем сваіх багоў.

Якой доўгай, як мара, заўсёды была ў нас дарога да сваёй хаты!

Спачатку мы ўважліва прыглядаліся, выбіраючы месца для будаўніцтва хаты. Назіралі, разважалі, думалі: дзе, у якім месцы паставіць сабе жытло?

Беларус ніколі не ставіў хату там, дзе расце асот ці конскае шчаўе. Ведаў, што там сыра, блізка грунтовая вада. Раніцою назіраў за расою — калі яна густая аж да цемнаты, там можна капаць калодзеж, але ніколі нельга рабіць хату: згніе! Ужо

і выбраўшы месца, клаў дошку на некалькі дзён: калі пад ёю завяліся макрыцы — дрэннае месца, калі мураўі — смела стаўляй хату. Тут будзеце жыць і ты, і яна, хата.

Лічылася, што заўсёды цёплым месцам для хаты будзе тое, дзе любяць ляжаць авечкі.

Мы баяліся памыліцца з месцам для аселішча. Былі ўпэўнены, што нельга будавацца на дарозе, на скрыжаваннях, на месцы лазні — там уся нечысць, насупраць варот — увесь набытак будзе знікаць з дому, на падмурку старога дому. Ніколі не ставілі мы сваіх хат на месцы згарэлых: паколькі пажар ужо засведчыў, што тут благое месца, зноў будавацца на папялішчы рызыкоўна.

Скрыжаванняў закінутых шляхоў мы асабліва баяліся. Верылі, што там перасякаюцца дарогі мёртвых і жывых, там, зачараваныя перакрыжаваннем, блукаюць, не ведаючы, як выбрацца, злыдні і нячыстая сіла — яны штоноч будуць галёкаць пад вокнамі.

Там мы ставілі крыжы і капліцы, а свае хаты адносілі ад іх як мага далей.

Шчаслівымі для будаўніцтва хаты ў нас лічыліся мясціны, дзе любілі сяліцца жывыя істоты — павукі, шэршні, пчолы, мураўі.

Мы амаль не ставілі сваю хату на зямлю. На поўначы, на Віцебшчыне, дзе вельмі шмат камення, пад вуглы хаты мы клалі валуны; на поўдні, на Палессі, дзе шмат лясоў, укопвалі дубовыя калоды ці смалістыя карчы — штандары. Мы заўсёды падымалі сваю хату над зямлёй і, як казалі нашы дзедзічы, ставілі яе «на стулы» *(Паводле Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на планеце Зямля»).*



*Мал. 9.* Сялянская сям'я на Палессі ў 1930-я гг.




*Мал. 10.* Анатоль Капцюг.
«Сялянская сядзіба ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў»




*Мал. 11.* Анатоль Капцюг. «Сялянская хата пачатку XX стагоддзя (восень, вечар)»

2. Што для вас значыць родны дом?

3. На якія прыкметы і павер'і абапіраліся беларусы пры будаўніцтве хаты?

4. Якімі паўстаюць беларусы ва ўяўленні Янкі Сіпакова? Пра якія рысы нацыянальнага характару сведчыць інфармацыя, пададзеная ў тэксце? Абгрунтуйце свой адказ.

### Заданне 4

1. Прачытайце тэкст. Прадстаўнікі якіх родаў валодалі маёнткам Аранчыцы?

Старадаўняя сядзіба, радавое гняздо Ляжэнскіх. Яшчэ з часоў уладарання караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта I Старога і каралевы Боны на аранчыцкіх землях асеў род Аранцаў, якія заклалі тут маёнтак і сад. У 1560 г. яны пабудавалі сядзібны дом. Ад іх прозвішча мясцовасць набыла назву Аранчыцы. Пасля Аранцаў маёнтак перайшоў да роду Іжынцаў. Адна са спадкаемцаў з гэтай лініі Юзэфа Дэрамер (1776–1852) была замужам за Ігнаціем Ляжэнскім і прынесла Аранчыцкі маёнтак у якасці пасагу.

Пасля Ігнація па спадчыне Аранчыцкім дваром валодалі Фердынант (1794–1858), Баляслаў (?–1917) і Павел (1880–1945) Ляжэнскія. Павел Ляжэнскі быў апошнім гаспадаром маёнтка. Яго сын Ежы (1906–1944), юрыст, пісьменнік, публіцыст быў растраляны немцамі ў Варшаве ў 1944 г. Унук Ежы — Цэзарый Ляжэнскі (1930–2006) — вядомы польскі пісьменнік, журналіст, абраны прэзідэнтам адзінага ў свеце Міжнароднага капітула ордэра ўсмешкі.

У 1939 г. сядзібны дом[1] Ляжэнскіх быў разрабаваны, а ў 1943 г. ён згарэў дашчэнту падчас драматычнага сутыкнення партызанскіх атрадаў з немцамі. На месцы, дзе існаваў Аранчыцкі двор, засталіся рэшткі пейзажнага парку.

---

[1] Сядзібны дом у Аранчыцах уяўляў сабой будынак памерам 7 × 20 м у форме выцягнутага прамавугольніка. Пабудаваны з дрэва на цагляным невысокім падмурку, ён меў адзін паверх, высокі чатырохсхільны вальмавы дах, накрыты гонтай і 2 дахавыя паўкруглыя акенцы. Цэнтральны фасад будынка вылучаўся невялікім порцікам на чатырох масіўных квадратных мураваных калонах, на якія абапіраўся трохвугольны шчыт. У XIX стагоддзі да правага боку дома прыбудавалі крыло. Бэлькі, якія падтрымлівалі столь, былі з лістоўніцы, у сталовай жа яны выгнуліся ў часы расійска-шведскай вайны, калі на гары дома ад вайсковых рэквізіцый хавалі збожжа *(Паводле Леаніда Несцярчука «Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў»)*.

На сённяшні час тэрыторыя колішняй сядзібы часткова забудавана індывідуальнымі дамамі, застаўся каскад аплыўшых і занядбаных сажалак, рэчышча рэчкі, старыя дрэвы вярбы ломкай, іншыя адзінкавыя дрэвы мясцовых парод. Рэшткі сядзібы патрабуюць узяцця на ўлік і пад ахову дзяржавы *(Паводле Леаніда Несцярчука «Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў»)*.

2. Вызначце гаспадароў старажытнай сядзібы, пра якіх распавядаецца ў тэксце. Расстаўце прозвішчы гаспадароў, што валодалі сядзібай у Аранчыцах, у храналагічнай паслядоўнасці.

3. Карыстаючыся картай тапонімаў Беларусі (https://toponim.by/), знайдзіце, у якім кутку Беларусі знаходзіўся сядзібны дом Ляжэнскіх.

4. Прачытайце схему сядзібы ў Аранчыцах (мал. 12). У якім годзе была створана схема сядзібы?




*Мал. 12.* Аранчыцы. Схема сядзібы, 1939

5. Прачытайце тэкст. Карыстаючыся інфармацыяй са схемы сядзібы ў Аранчыцах, запоўніце прабелы ў тэксце.

Колішні парк меў плошчу 5 га, стары сад, некалькі рыбных ставоў, пляж, каналы, алеі. Уязная алея была абсаджана ліпамі, таполямі, бэзам. У склад палацава-паркавага ансамбля ўваходзіў шэраг гаспадарчых пабудоў: … . Перад парадным ганкам мясцілася вялікая кветкавая клумба.

6. Інфармацыя пра якія пабудовы палацава-паркавага ансамбля, зафіксаваныя ў схеме, адсутнічае ў тэксце пра сядзібу ў Аранчыцах?

7. Выпішыце назвы гаспадарчых пабудоў. Растлумачце іх значэнне, карыстаючыся «Тлумачальным слоўнікам беларускай літаратурнай мовы». Знайдзіце да іх адпаведнікі ў сучаснай беларускай мове.

8. Якія ўмоўныя абазначэнні выкарыстаны ў схеме сядзібы для фіксацыі пабудоў палаца-паркавага ансамбля ў Аранчыцах?

## Заданне 5

1. Разгледзьце план сядзібнага дома ў Аранчыцах (мал. 13). У якім годзе быў створаны яго план?




*Мал. 13.* Аранчыцы. План сядзібнага дома, 1838

2. Якія пакоі ўваходзяць у склад сядзібнага дома? Якія ўмоўныя абазначэнні выкарыстаны для іх адлюстравання?

## Заданне 6

Уявіце сабе, што сядзібны дом Ляжэнскіх у Аранчыцах захаваўся. Вы з'яўляецеся супрацоўнікам камісіі па ахове даўніны і мастацтва Беларусі, якой даручылі скласці анатацыю, што раскрывае паходжанне, канструкцыю, выгляд будаўнічага аб'екта. Карыстаючыся данымі папярэдняга тэксту, а таксама інфармацыяй з даведнікаў і інтэрнэт-крыніц, складзіце «Пашпартныя звесткі шляхецкай сядзібы Ляжэнскіх».

***Пашпартныя звесткі***

*Населены пункт, сельсавет, вобласць*______________________

*(паводле сучаснага і, па магчымасці, дарэвалюцыйнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу — губерня, павет, воласць)*

*Аб'ект, яго мясцовая назва і прызначэнне*______________________

*Гаспадар пабудовы*______________________

*(прозвішча, імя і імя па бацьку, год нараджэння, прафесія, пасада)*

*Дата пабудовы*______________________

*Будаўнікі*______________________

*Матэрыял будынка*______________________

*Агульны памер будынка*______________________

*Назвы асобных частак будынка*______________________

*Дэкор*______________________

*Перавозка, перабудова, дабудова*______________________

*Прызначэнне ў нашы дні*______________________

*Прозвішча, імя і імя па бацьку краязнаўцы*______________________

*Дата* *Подпіс*

**Заданне 7**

1. Складзіце пашпарт пакоя, у якім вы пражываеце.

*Населены пункт, сельсавет, вобласць*___________________________________

*Аб'ект, яго мясцовая назва і прызначэнне*_______________________________

*Галоўны кватэранаймальнік*_________________________________________

*Дата пабудовы*_____________________________________________________

*Матэрыял будынка* __________________________________________________

*Агульны памер будынка*______________________________________________

*Назвы асобных частак будынка*_______________________________________

*Дэкор*___________________________________________________________

*Перавозка, перабудова, дабудова*_____________________________________

2. Складзіце схематычны план вашага пакоя, паказаўшы месца яго размяшчэння ў кватэры (доме).

3. Схематычна абазначце хатнія прадметы на плане вашага пакоя (кватэры), карыстаючыся пры гэтым умоўнымі абазначэннямі, знойдзенымі ў сетцы Інтэрнэт.

*Падагульненне*

— Які з прапанаваных матэрыялаў здаецца вам найбольш інфарматыўным? Карысным для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Падрыхтоўка пашпарта і схемы гістарычнага збудавання мясцовасці.

**V. Прэзентацыя праекта.** Паведамленне пра гістарычнае збудаванне мясцовасці.

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Што вы ўзялі для сябе са знаёмства з гістарычным будынкам, якому прысвечаны ваш праект?
- Якія меры па захаванні гістарычнага збудавання, якому прысвечаны ваш праект, можна прапанаваць?

# Модуль 2. Нашу дачку пазнаюць і ў андарачку

Адзенне — гэта аповед пра жыццё народа, яго сувязь з гісторыяй і прыродай.

*Янка Сіпакоў.*

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Дзе вы пазнаёміліся з беларускім нацыянальным касцюмам?
- Чым адрозніваецца беларускі нацыянальны касцюм ад нацыянальных касцюмаў іншых краін? Падмацуйце адказ прыкладамі (ілюстрацыямі).
- Растлумачце значэнне слова «строй». *(Паводле інфармацыі «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» слова «строй» абазначае комплекс адзення, характэрнага для якога-небудзь рэгіёна.)*
- Ці захаваліся здымкі вашых продкаў у нацыянальных строях або з іх элементамі? Падбярыце адпаведныя словы, каб апісаць камплектацыю строяў, іх колер, выкарыстаныя тканіны, крой. Растлумачце, з чым звязана тая ці іншая камплектацыя строяў, выкарыстаны колер і тканіна.
- На якіх дэталях адзення вашы продкі вышывалі арнамент? Які сэнс укладаўся ў арнамент? Прывядзіце прыклады.
- Ці ёсць у вашым гардэробе рэчы з нацыянальным арнаментам?

**Заданне 1**

1. Для чаго сёння набываюць адзенне з нацыянальным арнаментам? Для таго каб:

- выказаць свой патрыятызм?
- адпавядаць модным запытам?
- вылучыцца ў грамадстве?

Выкажыце згоду або нязгоду з прапанаванымі варыянтамі.

2. Дапоўніце свой адказ уласнымі сцвярджэннямі.

*Падагульненне*

— Беларускі нацыянальны строй з'яўляецца неад'емнай часткай культуры народа. Валодаючы функцыянальным прызначэннем, ён адлюстроўвае мясцовыя традыцыі, сацыяльны статус, светапогляд і патрэбы прадстаўнікоў беларускага народа.

— Наш праект будзе прысвечаны стварэнню сучаснага жаночага (мужчынскага) гардэробу з нацыянальнымі элементамі мясцовасці.

**II. Збор інфармацыі пра беларускі нацыянальны строй.**

Для збору інфармацыі можна выкарыстаць навуковую, гістарычную, мастацкую, навукова-папулярную, даведачную літаратуру з фондаў бібліятэк, архіваў; матэрыялы краязнаўчых, гістарычных, літаратурных, школьных музеяў;

інтэрнэт-рэсурсы; гістарычныя і сучасныя фотаздымкі, матэрыялы выданняў «Мастацтва», «Літаратура і мастацтва», «Культура»; сустрэчы з народнымі майстрамі і іх успаміны, этнаграфічныя экскурсіі і інш.

Карыснымі могуць быць наступныя крыніцы інфармацыі:


1. Беларускае народнае адзенне : альбом / М. Раманюк. — Мінск : Беларусь, 1981. — [47] с.

2. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар. — 4-е выд. — Мінск : Беларусь, 2023. — 223 с.

3. Бялявіна, В. М. Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2017. — 461, [2] с.

4. Беларускі народны арнамент : альбом / Савет прамысловай кааперацыі БССР ; склалі: К. І. Паўлава [і інш. ] ; адказны рэдактар В. Ф. Мацюшка ; уступны артыкул М. С. Кацара. — Мінск : [б. в.], 1953 (1955). — [137] л. : каляр. іл. ; 41 см.

5. Беларускія народныя строі : альбом / М. Раманюк. — Мінск : Д. Раманюк, 2003. — 77, [2] с.

6. Віннікава, М. Традыцыйны беларускі касцюм / М. Віннікава. — Мінск : Беларуская навука, 2016.

7. Жабінская, М. П. Складзі ўзор сам = Составь узор сам : народны арнамент у побыце / М. П. Жабінская ; пер. Л. М. Карамазава ; мастакі : М. П. Жабінская, А. С. Магумане. — Мінск : Полымя, 1992. — 218, [2] с. : іл., каляр. іл. ; 22 см. Тэкст паралельна на беларускай, рускай мовах. — Бібліяграфія: с. 218–219.

8. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : у 7 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 1984–1988.

9. Лабачэўская, В. Повязь часоў: беларускі ручнік / В. Лабачэўская — Мінск : Беларусь, 2002.

10. Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура) : вучэб. дапам. для 9-га класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання (з электронным дадаткам) / С. І. Колбышава [і інш.]. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2019. — 143 с.

11. Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2002. — 432 с.

12. Пасланні ад продкаў : пра што расказвае беларускі арнамент / склад. А. М. Коршак ; фота : А. П. Дрыбас [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2017. — 73, [6] с. : каляр. іл. ; 23x25 см. — (Энцыклапедыя народнага майстра).

13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агульнае рэдагаванне : Т. Б. Варфаламеева. — Мінск : Вышэйшая школа, 2001–2013.

14. Энцыклапедыя «Культура Беларусі». — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2010–2015.

15. Этнаграфія Беларусі : Энцыклапедыя. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1989. — 575 с.


— Якія з прапанаваных крыніц могуць дапамагчы ў пошуку інфармацыі пра нацыянальны касцюм вашай мясцовасці?

### Заданне 2

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння сучаснага гардэробу з нацыянальнымі элементамі.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: складанне сучаснага базавага жаночага (мужчынскага) гардэробу з нацыянальнымі элементамі мясцовасці.**

**Заданне 3**

1. Прачытайце тэкст. Якое значэнне для беларуса, на думку аўтара тэксту, мае нацыянальнае адзенне?

Наша адзенне хораша ўпісвалася ў нашы краявіды, падыходзіла да нашай працы і адпачынку, адпавядала нашаму ладу жыцця, ядналася з нашымі абрадамі і звычаямі.

У нацыянальным касцюме — душа, светапогляд беларускага народа. Яго погляд на прыроду, грамадства, сям'ю. Гармонія між чалавекам і светам. Уяўленне пра сваю існасць.

У пост мы насілі адно адзенне — у ім адсутнічаў чырвоны колер. На свае святы — Першай баразны, Першага снапа, Першага пракосу, у дзень выгану кароў на юр'еўскую расу — мы апраналіся вельмі ўрачыста. Сваё адзенне было ў нас на вяселле і радзіны, падчас радасці і жалобы.

У сваіх тканых рэчах мы выкарыстоўвалі шмат колераў — зялёны, жоўты, сіні, белы, аранжавы, блакітны, але пераважаў усё ж чырвоны. Бо ў даўнія часы чырвоны колер быў у нашых продкаў сімвалам жыцця.

Наша адзенне, маючы найперш вельмі практычнае, ужытковае значэнне, нясе ў сабе яшчэ і вялікі мастацкі вобраз і сэнс. Яно скіравана на чалавека і без чалавека не існуе — яны ўспрымаюцца толькі разам: чалавек і яго адзенне *(Паводле Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на планеце Зямля»).*

2. Якую каштоўнасць асабіста для вас мае нацыянальны касцюм? Абгрунтуйце свой адказ.

**Заданне 4**

1. Прачытайце тэкст. Якія прадметы ўваходзілі ў склад жаночага, а якія — у склад мужчынскага гардэробу?

Часам мы наракалі на свой лёс, скардзіліся, уздыхалі:

— Усе мае ўборы — лапці ды аборы.

І самі ведалі: крыху хітруем, нагаворваем на сябе, прыкідваемся.

Вядома, у свой час былі ў нас і лапці, і ногі свае мы спавівалі аборамі. Самаробныя, сплеценыя са свежага альбо размочанага ў цёплай вадзе лыка — ліповага ці лазовага — лапці ад самай старажытнасці былі асноўным нашым абуткам.

Але ж мы заўсёды любілі і ўмелі прыгожа, дыхтоўна і зручна абувацца і апранацца.

Тыя ж нашы лапці часцей за ўсё мелі выгляд аздобы, упрыгажэння, а не ўсяго толькі абутку. Асабліва на жаночых нагах. Жанчыны ўмелі ўбачыць у іх і паказаць усім і вытанчанасць саміх лапцей, і асабліва павабнасць, гожасць сваіх ножак, абутых у звычайнае лыка.

Падплеценыя пахлапні, лапці касога пляцення, былі такія зграбненькія, што тагачасныя модніцы па некалькі гадоў запар фарсілі ў іх толькі ў святы: і лапці, і беленькія анучы, перавязаныя пафарбаванымі аборамі, выглядалі вельмі шыкоўна.

І мужчынская нага ў лапцях, зімою закручаная ў суконкі, абкладзеная ў вялікія маразы сенам ці дробнаю саломаю, абгорнутая зверху белаю палатнянаю анучаю, выглядала таксама вельмі раскошна.

Рабіліся лапці лёгка, проста і хутка — за вечар селянін мог сплесці адну, а то і дзве пары лапцей.

І яны хораша глядзеліся з нашым адзеннем: з андараком, фартухом ці з кошыкам — у жанчын, з саламяным капелюшом ды цэпам у руках — у мужчын.

Што ж, у лапцях тады хадзілі не толькі мы, а і шмат якія іншыя народы — усходнія і заходнія славяне, балты, шматлікія плямёны Расіі.

У лапцях фарсілі і мы.

Тунікападобная, доўгая, ніжэй каленяў кашуля з самаробнага палатна была калісьці ці не адзіным нашым адзеннем. Сеялі лён-каноплі, мялі і пралі і ткалі палатно. А потым адну полку палатна перагіналі на дзве роўныя палавінкі. А на лініі перагібу выразалі адтуліну для галавы, прышывалі рукавы ды ўстаўлялі кліны, калі камусьці кашуля здавалася цеснаватаю.

Кашуля — найстаражытны від нашага адзення. Яе даўней насілі мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці. Насілі на кожны дзень, у святы і ў будні.

Штаноў мы доўга не прызнавалі — мусіць, набраліся грэблівасці ад рымлян, якія, носячы тогу, называлі штаны адзеннем барабараў, адзяванне іх лічылі вялікаю абразаю для мужчын і былі перакананы, што порткі прыніжаюць годнасць грамадзяніна Рыма.

І ўсё ж свае нагавіцы — адзенне для ног — мы пашылі. Але з кашуляю не раставаліся ўсё роўна — яе мы надзявалі на выпуск, зверху порткаў. У нагавіцах не было кішэняў, таму мы падпярэзваліся поясам, на якім вісела каліта, куды мы клалі ўсе патрэбныя нам рэчы.

Даўней мужчынскага адзення ў нас было не шмат: сарочка, штаны, світа, пояс. І пояс для нас, мужчын, меў ці не самае галоўнае значэнне.

Мікалай Нікіфароўскі, беларускі этнограф і фалькларыст, расказваючы пра тую ўвагу, якую беларус надаваў поясу, пісаў, што з’яўленне на людзях «без шапкі і басанож не здзівіць старонніх так, як з’яўленне без апаяскі».

Плеценыя, тканыя і вязаныя паясы былі абавязковым атрыбутам мужчынскага адзення. Шырыня іх дасягала 26 сантыметраў, даўжыня — да 3 метраў, і абкручвалі іх мужчыны вакол сябе 3-4 разы. Поясам падпярэзвалі не толькі сарочкі, але і верхняе адзенне. І на кожным вісела каліта — шабетка, мяшэчак, дзе мы насілі тытунь і грошы.

Адтуль шэдэўры нашага шоўкаткацтва — слуцкія паясы. Акрамя Слуцка, паясы такога ж узору выраблялiся ў нас у Гародні, Нясвіжы, Ружанах, Ліпкаве, ды яшчэ ў Кракаве і ў Францыі.

Мужчынскія шапкі — магеркі, малахаі, шапкі з вушамі, кучомкі, каўпакі, брылі. У XI–XII стагоддзях мы шылі шапкі з футра лісы, вавёркі, зайца. Затым з аўчыны — футрам навонкі. Наша старадаўняя шапка — аблавушка. Мы шылі яе таксама з аўчыны, падбівалі кудзеляй, пацягвалі сукном. Але больш прыгожа выглядалі аблавухі, пашытыя з лісінага ці вавёрчынага футра. А яшчэ мы насілі валеныя шапкі, зробленыя з воўны — магеркі, валёнкі, валеныя брылі. А летам на нашых галовах хораша глядзеліся саламяныя капелюшы.




*Мал. 14–20.* Юлія Мацура. Мужчынскія шапкі

Апрача кашулі, была ў нас яшчэ мужчынская безрукаўка, камізэлька, якую потым у нас перахапілі жанчыны і назвалі яе па-свойму — гарсэтам. Як жа прыгожа яна пачала глядзецца на вабнай жаночай постаці! Пашыты з аксаміту, парчы ці шоўку, шыкоўны гарсэцік, які аблягаў жаночы стан, зрабіўся для мужчын такім прывабным.




*Мал. 21.* Юлія Мацура. Гарсэт

З верхняга адзення нас — і мужчын, і жанчын — заўсёды ратавалі ў стагоддзях світа, сярмяга, латушка, бурнос, кажух. Шылі мы світкі з валенага нефарбаванага сукна, а кажух — з дублёных і недублёных белых і вохрыста-чорных аўчын. І ведаеце, нашы, футрам падшытыя ўзімку, світы, а таксама кажухі хораша глядзеліся нават на князях і каралях. Кароль Польшчы Ягайла, звыклы да сваіх беларускіх аўчын, і ў каралеўскім замку на Вавелі хадзіў у звычайным кажуху, пацягнутым сукном.




*Мал. 22–27.* Юлія Мацура. Верхняе адзенне

Ужо не кажучы пра жанчын, якія і тады свае кажухі ды світы гэтак выштукоўвалі, што яны адразу ж выглядалі не толькі адзеннем, але і прадметам сапраўднага мастацтва — на іх прыемна было глядзець.

Баяры шылі вопратку з прывезеных тканін — з парчы, аксаміту, тафты, камкі. Магнаты ўпрыгожвалі свае строі залатой і сярэбранай вышыўкай, каштоўнымі камянямі. Князі апраналіся ў воўчае і бабровае футра, княгіні насілі залататканае адзенне.

Тканіны тады каштавалі вельмі дорага — як і каштоўныя камяні.

Было ў нас і асаблівае мужчынскае адзенне, якое насілі толькі воі. Гэта — кальчугі. Яны каваліся з маленькіх жалезных кольцаў. Такія нашы кашулі былі вельмі цяжкія — некаторыя кальчугі збіраліся аж з 60 тысяч кольцаў.




*Мал. 28.* Юлія Мацура. Кальчуга

Але і жанчыны мелі і маюць сваё адзенне, якое спрадвеку было і ёсць толькі жаночае. Без гэтага адзення, шчыра кажучы, няма ніякага адзення ў жанчын. Яно нават самую сціплую, звычайную вопратку робіць шыкоўнай, прыгожай.

Гэтыя ўборы — жаночыя ўпрыгажэнні.

У час Полацкага і Турава-Пінскага княства не было асаблівай розніцы паміж гарадскім і сялянскім адзеннем. Толькі княжацкія строі вылучаліся дарагімі тканінамі і візантыйскім кроем. І адрозніваліся ўпрыгажэннямі: гарадскія модніцы насілі шкляныя бранзалеты, пярсцёнкі і скроневыя кольцы, а сялянкі больш за ўсё любілі пацеркі.

Спачатку яны былі з зубоў лася ды мядзведзя, а таксама з бурштыну. На адну нітку прыгажуні нанізвалі да 400 пацерак. Былі ў модзе бісер, сярэбраныя і бронзавыя зярнёныя пацеркі і, вядома ж, залатыя.

А колькі выдумкі, густу, дасканаласці, знаходлівасці праяўлялі беларускія жанчыны, ткучы і шыючы ўсё для сябе самой і апранаючы ўсю сям'ю.

А якія галаўныя ўборы яны стваралі, прыдумлялі для сябе — каб тыя яшчэ болей падкрэслівалі прыгажосць і вабнасць іхніх твараў! Для гэтага выкарыстоўвалі самае тонкае сваё палатно і тыя куплёныя тканіны, якія былі даступныя сялянцы.

Дзяўчаты па святах упляталі ў валасы стужкі, укоснікі, каснікі, а ў звычайныя дні — уплёткі, акройкі каляровай матэрыі. Непакрытая галава была ў нас адзнакаю дзявоцтва. Таму дзяўчаты часцей за ўсё хадзілі галалобыя, а нашы старажытныя дзявочыя ўборы не мелі верху. Вянкі — палоскі з бяросты ці лубу — абшываліся тканінай і ўпрыгожваліся ніткамі, шклянымі пацеркамі, металічнымі бляшкамі, а скіндачкі, шлячкі — галаўныя павязкі ў выглядзе вузкага ручніка з арнаментаванымі канцамі ці вышываным налобнікам — завязваліся так, каб не закрываць валасы на макушцы.




*Мал. 29–30.* Юлія Мацура. Вянкі

А ўжо замужняя жанчына не магла з’явіцца на людзях з непакрытай галавою. Яе галава заўсёды была прыбрана ці то наміткаю, сярпанкаю, хусткаю, ці то галовачкай, сарокаю ды рожкамі, ці то каптурыкам, падвічкаю або чапцом.




*Мал. 31–36.* Юлія Мацура. Жаночыя галаўныя ўборы

Найбольш шанавалася нашымі жанчынамі намітка — яна неверагодна шматлікімі спосабамі павівалася вакол галавы, прыгожа драпіравалася на спіне, а таму жаночая постаць у ёй рабілася статнай і велічнай.




*Мал. 37.* Юлія Мацура. Намітка

І ў жанчын у даўніну асноўным адзеннем была кашуля. Яна, зусім белая, вышывалася на рукавах, на манжэтах, на каўняры, на грудзях і мела заўсёды своеасаблівы выгляд у залежнасці ад таго, як і з чым жанчына яе апранала: насіла са спадніцай і фартушком, або са спадніцай і гарсэтам, або з андаракам, пярэднічкам ці ліфам.

Ніжняе адзенне, у якое запраўлялася кашуля, пашытае з даматканага палатна, спрадвек называлася спадніцаю.

Спадніцы, якія шыліся з шарсцяной тканіны свойскага вырабу, мы звалі і завём андаракам.

Паясное жаночае адзенне, пашытае з куплёнай шарсцяной тканіны ці тонкага крамнага сукна, аздобленае аксамітамі, было для нас саянам і каштавала вельмі дарага — аж чатыры капы грошай.







*Мал. 38–39.* Юлія Мацура. Паяснoе жаночае адзенне

Кунтуш — верхняе адзенне заможных мужчын — мы насілі заўсёды расшпіленым. Каб быў відаць жупан, на які апранаўся кунтуш. Хацелася, каб усе бачылі і тое, і другое, бо яны абодва — прыгожыя: кунтуш быў суконны ці шаўковы, падшыты футрам, а жупан з белага сукна, блакітнага атласу ці кармазынавы.







*Мал. 40–41.* Юлія Мацура. Адзенне заможных мужчын

Вільчуру — зімовае мужчынскае адзенне з ваўчынага футра з вялікім каўняром — мы звычайна апраналі зімою ў дарогу.

Камізэльку адзявалі толькі пад сурдут — з’яўляцца на людзях у адной камізэльцы, хоць і зашпіленай на ўсё гузікі, лічылася непрыстойным.




*Мал. 42.* Юлія Мацура. Сурдут

Сак, што ў перакладзе з французскага абазначае «мяшок», наша кароткае і прасторнае адзенне, спачатку быў мужчынскім, але, калі ў нас з’явіўся пінжак, яго зноў жа перахапілі жанчыны, і ён, расклёшаны, з прыгожымі складкамі і вышыўкай, зрабіўся іхнім.




*Мал. 43.* Юлія Мацура. Сак

Жаночае манто вольнага крою, пашытае з тканіны ці футра, зашпільвалася на адзін гаплік ці завязвалася ля шыі. Ад паліто яно адрознівалася тым, што не мела зашпілек аж да самага нізу. І сёння яно блізкае княжацкім вопраткам, якія таксама трымаліся толькі на адным гузіку зверху *(Паводле Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на планеце Зямля»).*



*Мал. 44.* Стары і хлопчык плятуць лапці. Палессе, 1936




*Мал. 45.* Чатыры дзяўчыны ў строях. Мазырскі раён, в. Прудок, 1911. Фотаздымак з калекцыі Ісака Сербава

2. Якое адзенне выбіралі сяляне ці гарадскія жыхары, а якое — баяры ці магнаты? Пры неабходнасці выкарыстайце даведачныя выданні.

Што насілі ўлетку, а з якіх прадметаў адзення складаўся гардэроб узімку? Якія галаўныя ўборы насілі дзяўчаты, а якія — замужнія жанчыны?

3. Размяркуйце назвы прадметаў адзення (табл. 1).

*Табліца 1*

**Адзенне беларусаў**

| Мужчынскі гардэроб | Жаночы гардэроб |
|---|---|
| | |

— Якія з прадметаў адзення выкарыстоўваюцца як у жаночым, так і ў мужчынскім гардэробе? Якія з прадметаў гардэробу выйшлі з абіходу? Абгрунтуйце свой адказ.

4. Як адносіцца аўтар тэксту да беларускіх жанчын, мужчын? Якія літаратурныя сродкі ён выкарыстоўвае, каб выказаць свае адносіны? Пацвердзіце сваё меркаванне прыкладамі з тэксту. Ці згодны вы з меркаваннем аўтара тэксту? Абгрунтуйце сваю думку.

5. Наведайце краязнаўчы музей вашай мясцовасці. Пазнаёмцеся з прадстаўленымі там нацыянальнымі строямі. Атрымаўшы дазвол, зрабіце здымкі нацыянальнага строю. Запоўніце табліцу 2 па адным з іх, выкарыстоўваючы інфармацыю з экспазіцыі музея.

*Табліца 2*

**Пашпарт нацыянальнага строю**

| | |
|---|---|
| Фотаздымак | |
| Рэгіён | |
| Мужчынскі/жаночы | |
| Сялянскі/мяшчанскі/шляхецкі | |
| Святочны/паўсядзённы | |
| Камплектнасць | |
| Матэрыял | |

6. Разгледзьце карту разнавіднасцей сялянскага строю па рэгіёнах (мал. 46). Суаднясіце малюнкі нацыянальных строяў з іх подпісамі.



*Мал. 46.* Карта разнавіднасцей сялянскага строю

**Народныя касцюмы цэнтральнай Беларусі і Нёманскага рэгіёна:**
Пухавічы (1), Ляхавічы (2), Копыль і Клецк (3), Слуцк (4)
Вілейка (5)
Масты (6), Навагрудак (7)
Ваўкавыск, Каменец (8–9)

**Народныя касцюмы Палесся:**
Дамачава (10)
Маларыта (11), Кобрын (12), Пінск (13), Моталь (14)
Давыд-Гарадок і Тураў (15), Тураў і Мазыр (16)
Калінкавічы (17), Брагін (18)

**Касцюмы беларускага Прыдняпроўя і Падзвіння:**
Магілёў (19–20), Краснапольск (21)
Буда-Кашалёва (22), Няглюбка (23)
Лепель (24), Дуброўна (25)
Астравец і Дзісна (26–27)

— Знайдзіце нацыянальны строй вашага рэгіёна і вылучыце яго асаблівасці. Параўнайце яго з касцюмам іншага рэгіёна, напрыклад, г. Кобрына. Запоўніце табліцу 3.

*Табліца 3*

**Касцюм маёй мясцовасці**

| Назва рэгіёна, вёскі | Строй Кобрынскага раёна, в. Варатынічы | Мясцовы строй | Адрозненні |
|---|---|---|---|
| Асаблівасці ў кашулі | | | |
| Асаблівасці ў спадніцы/нагавіцах | | | |
| Асаблівасці галаўнога ўбору | | | |
| Асаблівасці ўпрыгажэнняў / наяўнасць пояса (яго аздабленне) | | | |

### Заданне 5

Класіфікацыя народных строяў па рэгіёнах была распрацавана Міхасём Раманюком — вядомым даследчыкам беларускага нацыянальнага касцюма, які правёў шмат экспедыцый па розных кутках Беларусі (мал. 47). У яго каштоўным зборы і архіве налічвалася звыш 100 000 адзінак унікальнага этнаграфічнага матэрыялу. Пазнаёмцеся з яго альбомам «Беларускія народныя строі» (мал. 48). Ці ёсць у яго калекцыі строі вашай мясцовасці? Падрыхтуйце кароткае паведамленне пра ўклад гэтага выдатнага вучонага ў захаванне спадчыны нашых продкаў.



Мал. 47. Міхась Раманюк падчас адной з экспедыцый па Беларусі



Мал. 48. Міхась Раманюк. «Беларускія народныя строі»

## Заданне 6

1. Прачытайце верш Сяргея Давідовіча «Вышыванкавы час».

Вышываныя кашулі
О, як грэлі сэрца нам!
Стрэсла грошыкі матуля
І купіла іх сынам.

Не таму, што гэта модна,
І ні ў гору нос — фарсіць,
А па-беларуску, годна,
Наказала іх насіць.

Вечарынка ці гулянка
І жаданей, і мілей.
І рабіла вышыванка
Кожнага душой чысцей.

Успамін не дапаможа
Тагачасных бачыць нас...
Як жа выглядаў прыгожа
Вышыванкавы той час!

2. Як вы разумееце назву верша? Ці можна сказаць, што мы жывём у вышыванкавы час? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

3. Карыстаючыся разнастайнымі крыніцамі: слоўнікамі, энцыклапедыямі, інтэрнэт-крыніцамі, намалюйце беларускія арнаменты: сімвал «моцнай сям'і», «маці», «маці з дзіцём», роднай Беларусі.

4. Пры дапамозе разнастайнага размяшчэння голуба і галубкі, які ў народзе заўсёды лічыўся сімвалам кахання, намалюйце, калі:

- каханне паміж хлопцам і дзяўчынай толькі пачынаецца;
- каханне паміж хлопцам і дзяўчынай у самым росквіце;
- каханне паміж хлопцам і дзяўчынай ужо скончылася або каханне без узаемнасці.

5. У сярэдзіне 2010-х гадоў у Беларусі пачалі імкліва набіраць папулярнасць адзенне і аксесуары ў нацыянальным стылі сярод моладзі і дзелавых людзей. Зрабіце паведамленне ў класе на тэму «Дні вышыванкі ў Беларусі», фестываль-конкурс «Этна Стыль».

## Заданне 7

Выраб вопраткі з элементамі народнага касцюма ў Беларусі ажыццяўляюць не толькі народныя майстры, але і прадпрыемствы. Адным з такіх з'яўляецца навукова-вытворчае прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца».

1. Наведайце інтэрнэт-магазін «Скарбніца» і пазнаёмцеся з іх прадукцыяй. Што вы набылі б для кожнага члена сваёй сям'і з раздзела «вопратка»?

2. Якія прадпрыемствы нашай краіны займаюцца вытворчасцю падобнай прадукцыі? Назавіце этнамагазіны вашай мясцовасці.

*Падагульненне*

— Які з прапанаваных матэрыялаў здаецца вам найбольш інфарматыўным? Карысным для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Складанне сучаснага базавага жаночага (мужчынскага) гардэробу з нацыянальнымі элементамі мясцовасці.

**V. Прэзентацыя праекта.** Выстава малюнкаў і эскізаў з каментарыямі аўтараў.

**VI. Рэфлексія.** Абмяркуйце падрыхтаваны вамі жаночы або мужчынскі гардэроб з нацыянальнымі элементамі мясцовасці.

- Што вам даў гэты праект?
- Што вас уразіла ад знаёмства з касцюмам вашай мясцовасці?
- Што вы ўзялі для сябе са знаёмства з беларускім нацыянальным строем?
- Якія іншыя цікавыя праекты пра беларускі нацыянальны касцюм можна арганізаваць?

# Модуль 3. Што хутарок — то гаварок, што сяльцо — то слаўцо

Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы…
ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы…

*Францішак Багушэвіч.*

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Дзе вы сустракаліся з дыялектамі беларускай мовы?
- Хто карыстаецца дыялектнай мовай (гаворкай)?
- Прачытайце тлумачэнне слова «дыялект».

З інфармацыі «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» слова «дыялект» абазначае мясцовую разнавіднасць мовы, якая адрозніваецца ад сумежных гаворак своеасаблівымі фанетычнымі, граматычнымі і лексічнымі рысамі.

— Прывядзіце прыклады вядомых вам дыялектных слоў.
— Што дае нам вывучэнне дыялектнай мовы мясцовасці?
— Якім чынам сёння аберагаюцца беларускія гаворкі (дыялекты)?
— Што мы можам зрабіць для захавання беларускай гаворкі сваёй мясцовасці?

### Заданне 1

1. Прачытайце народныя прыкметы. Як Вы разумееце іх сэнс?

✓ Пляваца нільзя — на тым свеце гарачую патэльню лізаць будзіш.

✓ Калі дзяўчына сніць, што бацян ляціць, — замуж выйдзіць.

✓ Калі рабёнак спужаецца, нада мець лён (семя), паставіць рабёнка, абвясці кругом тоненькім слоем і запаліць.

✓ Як, ідучы по лесу, поеш і пачуеш, як крумкае ворона, то можэш встрэціць воўка.

✓ Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку печка грэе.

Перад тым, як вугнаць карову пасля зімы на пашу, пад вароця хлева клалі сякеру, нажа і яйцэ. Шчэ ставілі вядро вады, штоб малака багато давала.

✓ Калі на Коляды разбіваецца што-нібудзь з посуду, то посуд будзе біцца ўвесь год.

✓ Калі ў студзені дажджы — дабра не жджы.

✓ Калі студзень імглісты — мокры год, калі халодны — позняя вясна і халоднае лета.

2. Вылучыце народныя прыкметы, якія выказаныя на гаворцы, а якія — на літаратурнай мове.

3. Замяніце словы народнай гаворкі агульнаўжывальнымі літаратурнымі словамі.

*Падагульненне*

— Беларуская нацыянальная мова з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнай культуры народа, сродкам захавання нацыянальнай адметнасці, развіцця нацыянальнай свядомасці і ідэнтычнасці.

— Наш праект будзе прысвечаны дыялектным асаблівасцям мясцовасці.

**II. Збор інфармацыі пра дыялектныя асаблівасці мясцовасці.**

Існуе шмат разнастайных крыніц, дзе можна знайсці звесткі пра дыялектныя асаблівасці мясцовасці. Вось некаторыя з іх:

1. Барадулін, Р. Збор твораў : у 5 т. / Р. Барадулін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1996–2002. — Т. 4 : Крытычныя артыкулы. Успаміны. Літаратурныя запісы. Вушацкі слоўазбор. — 2002. — 501 с.
2. Вусная беларуская мова : хрэстаматыя / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск : Навука і тэхніка, 1990. — 269, [1] с.
3. Гісторыя беларускай мовы. Хрэстаматыя : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спецыяльнасці «Беларуская філалогія (па напрамках)» / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. — Мінск : БДУ, 2022. — 230, [1] с.
4. Гістарычны слоўнік беларускай мовы : інфармацыйна-даведачны выпуск / Н. В. Паляшчук [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2022. — 271 с.
5. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы: уступныя артыкулы, даведачныя матэрыялы і каментарыі да карт / Р. І. Аванесаў [і інш.]. — Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1963. — 969, [2] с.
6. Народная словатворчасць / рэд. А. А. Крывіцкі, І. Я. Яшкін. — Мінск : Навука і тэхніка, 1979. — 336 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.]. — Мінск : Вышэйшая школа, 2001–2013. — Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. — 2009. — 863 с.
8. Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы : у 2 ч. / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук Беларускай ССР, 1961–1962.
9. Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі. Цэнтральная зона / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Беларуская навука, 2009. — 527, [2] с.
10. Шакун, Л. Карані роднай мовы : выбраныя працы па гісторыі беларускай мовы / Л. М. Шакун. — Мінск : [б. в.], 2001. — 205 с.

— Якія з прапанаваных крыніц могуць дапамагчы ў пошуку інфармацыі пра дыялектныя асаблівасці вашай мясцовасці?

**Заданне 2**

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння вашага праекта пра дыялектныя асаблівасці мясцовасці.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: слоўнік «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці».**

**Заданне 3**

Карыстаючыся «Лексічным атласам беларускіх народных гаворак», прасачыце, як мяняліся назвы слоў (словазлучэнняў) «шыпшына», «цвік», «дзяўчына-падлетак», «хлапчук», «плады дзікай яблыні», «далонь», «чарот», «рэха»,

«калыхацца на гушкалцы» (на выбар) у залежнасці ад вобласці або мясцовасці іх выкарыстання. Запоўніце табліцу 4. Дадайце інфармацыю, якой не хапае.

*Табліца 4*

**Літаратурная і дыялектная форма слоў**

| Слова ў сучасным выкарыстанні | Дыялектная форма слова ў вашай мясцовасці | Дыялектная форма слова ў ... вобласці | Дыялектная форма слова ў ... вобласці | Дыялектная форма слова ў ... вобласці | Дыялектная форма слова ў ... вобласці | Дыялектная форма слова ў ... вобласці | Дыялектная форма слова ў ... вобласці |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |

### Заданне 4

1. Карыстаючыся картай, наратыўнай і іншай інфармацыяй, складзіце спіс тапонімаў, якія знаходзяцца ў мясцовасці, дзе вы пражываеце.

2. Ці ўсе тапонімы насілі сучасныя назвы? Высвятліце гэта, карыстаючыся разнастайнымі крыніцамі. Якія з населеных пунктаў былі цалкам перайменаваныя? Запоўніце табліцу 5.

*Табліца 5*

**Назвы тапонімаў**

| Сучасная назва | Старадаўняя назва |
|---|---|
| | |

3. У сувязі з чым адбылося іх перайменаванне?
4. Высвятліце паходжанне тапоніма вашай мясцовасці.

### Заданне 5

1. Прачытайце тэкст. Падкрэсліце ўстарэлыя формы імёнаў.

Нашы імёны: Якута, Парвен, Сахон (Сафрон), Цыцыля, Макрэда, Піліп, Стахван, Касцюк, Змітра (Змітрок), Аўдоцця, Аміллян (Міллян), Ігнат, Лукаш (Лукан), Нікіпар, Салівей, Тумаш, Хвядос, Лаўрэн, Іллюк, Агата, Цярэшка, Пятрок, Трахім, Паўка, Хведар, Праксэда, Купрыян, Патап, Аляксей (Лёхта), Анця, Галя, Люцэя, Колюсь, Вікця, Яўхім.

Ты будзеш рыбу пярчыць ці цыбуліць? Налупіла бульбы, надрала й напякла бліноў стог. Слабы з яго ядун. Трошку цірне́ць адчапнога, кажаць: «Вот наеўся, аж вочы поўнымі сталі». Місачку чуць-чуць змучыў. Кажа: «Што ў мяне жывот — тры полкі?» Да свяжыны падрыхтуем гарэлку. Кароўскае масла. Чорны хлеб за ўсё смачней, ён жытны́. Павячэралі за ціхаю гадзінаю.

Ячмень ужо плечы выставіў — так саспеў. Дождж як уліў! Заліўны дождж. Там авёс палеглы. Жыта, хоць яго лічы. Пшаніца адборная, хоць бусы рабі й вешай маладой на шыю. Гэты год пчолам гадзі́ла *(Паводле Акуліны Андрэеўны Барадулінай. «Вушацкі словазбор Рыгора Барадуліна»)*.

2. Падбярыце сучасныя адпаведнікі імёнам, пададзеным у тэксце. Запоўніце табліцу 6.

*Табліца 6*

**Імёны**

| Дыялектная назва імя | Сучасная назва імя |
|---|---|
| | |

3. Якія варыянты вашага імя сустракаюцца ў мясцовасці, дзе вы пражываеце?

4. Як вы ведаеце, вельмі часта бацькі давалі імя сваім дзецям, сыходзячы з веравызнання, якога прытрымліваліся. Якія з імёнаў, выкарыстаных у тэксце, належаць да форм, характэрных для праваслаўнай традыцыі, а якія — каталіцкай?

5. Выказванне Акуліны Андрэеўны насычана метафарамі. Знайдзіце іх у тэксце. Растлумачце іх значэнне. Пра што сведчыць шырокае ўжыванне метафар у тэксце?

## Заданне 6

1. Прачытайце тэкст. Якія з пранаваных гульняў вы ведаеце?

***ВЯРОВАЧКА,*** *у вяро́вачку.*

Гульня хлопчыкаў і дзяўчынак з вяровачкай, звычайна са звязанымі канцамі. *Во́зьмеш вяро́вачку, насу́няш яе́ на сталé, каб было нéкулькі дзі́рак, як ні пападзé па́льцам у ту́ю дзі́рку, каб задзержа́ць, то прагуляў.* Зарубічы. 2. Гульня хлопчыкаў і дзяўчынак з вяровачкай. Станавіліся ў круг, пабраўшыся за вяровачку. Адзін пасярэдзіне круга з завязанымі вачыма стараецца злавіць каго-небудзь з гуляючых, пры гэтым можна ўхіляцца, але нельга адпускаць вяровачку. *Усé трымаюцца за вяро́вачку, хо́дзяць, ухіляюцца, каб ён ні мог злапа́ць.* Бакуны.

***ГАРЭЛКІ****, у гарэлкі.*

Гульня хлопчыкаў і дзяўчынак. Удзельнікі гульні становяцца парамі. Выбіраецца арганізатар гульні. Ён выступае і кажа: «*Гары, гары ясна, штóбы не пага́сло! Задняя пара ўпяро́д!*» Пасля гэтага задняя пара выбягае ўперад і стараецца перабегчы вызначаную граніцу. Той, хто водзіць, стараецца пару затрымаць. Калі затрымае, ролі мяняюцца. Хлопец ідзе на яго месца вадзіць. *У гарэлкі са́ма інцярэсная была́ ігра́.* Табольская будка

***КАЛЬЦЭ,*** *у кальцэ.*

Гульня хлопчыкаў і дзяўчынак. Усе становяцца ў адзін рад і перад сабой трымаюць складзеныя далоні. Вядучы падыходзіць да кожнага, трымаючы ў прыгаршчах пярсцёнак, і робіць выгляд, што кожнаму з удзельнікаў кладзе яго ў далоні, на самай справе непрыкметна апускае пярсцёнак у рукі аднаго з удзельнікаў. Той, хто водзіць, павінен адгадаць, у каго пярсцёнак. *Ста́ням у рад і трыма́ям ру́кі, каму палóжыць кальцӭ.* Забагоннікі *(Паводле кнігі: Народная словатворчасць / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск : Навука і тэхніка, 1979. — 333 с.).*

2. З якой мэтай быў надрукаваны тэкст? Што на гэта ўказвае?

3. У якіх мясцовасцях былі зафіксаваныя гульні, пра якія распавядаецца ў тэксце?

4. Падкрэсліце частку тэксту з дыялектнымі словамі. Спішыце сказы, замяніўшы дыялектныя словы агульнаўжывальнымі.

5. Прааналізуйце будову артыкула. Запішыце яго план.

6. Прааналізуйце графічны складнік тэксту. Для чаго аўтарам тэксту выкарыстаны разнастайныя шрыфты і абазначэнні?

7. Паспрабуйце рэканструяваць гульні, пададзеныя ў тэксце.

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з’яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Падрыхтоўка слоўніка «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці».

**V. Прэзентацыя праекта.** Рэканструкцыя гульні, змешчанай у слоўніку «Мясцовыя дзіцячыя гульні і забавы ў гаворках мясцовасці».

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Назавіце гульні, з якімі вы пазнаёміліся падчас праекта, што зацікавяць дзяцей у нашыя дні.
- Што можна зрабіць для таго, каб гульні, якім прысвечаны ваш праект, захаваліся?

# Модуль 4. Смачна было, ды блізка дно

Калі на свеце нехта дзесьці
Умее добра працаваць, —
То ўмее ён і смачна з'есці
І — адпаведна — згатаваць!

Таму — дастойна, без эфекту
Прымай падзяку-пахвалу —
І беларускаму палетку,
І беларускаму сталу!

*Ніл Гілевіч.*

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Што з беларускай кухні вы елі апошнім часам? А што гатавалі?
- Якія нацыянальныя стравы ведаеце? Якія з іх любіце? Якія прадукты выкарыстоўваюцца пры гатаванні пералічаных вамі страў?
- Чаму ў беларускіх стравах дамінуюць адны прадукты і цалкам адсутнічаюць іншыя? Растлумачце свой адказ.
- Ці можам мы пазнаёміцца з мясцовымі звычаямі і традыцыямі, гатуючы стравы мясцовай кухні? Абгрунтуйце свой адказ.

*Падагульненне*

— Навошта нам трэба вывучаць нацыянальную кухню?

— Вызначце, якім стравам мясцовасці будзе прысвечаны наш праект. Растлумачце свой выбар.

**ІІ. Збор інфармацыі пра мясцовыя стравы.**

Існуе шмат разнастайных крыніц, дзе можна знайсці звесткі пра мясцовыя стравы. Вось некаторыя з іх:

1. Літоўская гаспадыня: першая беларуская гаспадарча-кулінарная энцыклапедыя / пер. з польс. П. Р. Казлоўскага, В. В. Нядзвецкай ; прадмова А. Мальдзіса. — Мінск : Беларусь, 2017. — 383 с.
2. Сысоева, І. А. Працоўнае навучанне: абслуговая праца : вучэб. дапам. для 6-га класа устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / І. А. Сысоева, М. У. Ганіна, Т. П. Уласевіч. — Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022. — 247 с.
3. Сталярова, С. І. Працоўнае навучанне. Абслуговая праца: вучэб. дапам. для 7-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / С. І. Сталярова, Н. А. Юрчанка. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023. — 271 с.
4. Сталярова, С. І. Працоўнае навучанне. Абслуговая праца : вучэб. дапам. для 8-га класа агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / С. І. Сталярова, Н. А. Юрчанка, Н. Л. Кардаш. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2018. — 223 с.
5. Сталярова, С. І. Працоўнае навучанне. Абслуговая праца : вучэб. дапам. для 9-га класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. І. Сталярова, Н. А. Юрчанка. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2019. — 223 с.

6. Смачна есці!: белорусская кухня с историей / Группа компаний «Белагро». — 2-е изд. — Минск : Четыре четверти, 2018. — 99 с.
7. Смачна есці: энциклопедия белорусской кухни / сост. : Н. П. Познякевич, Е. И. Яроцкая. — Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2011. — 415 с.
8. Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі. Цэнтральная зона / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Беларуская навука, 2009. — 527 с.

— Якія з прапанаваных крыніц могуць вам дапамагчы знайсці інфармацыю пра мясцовыя стравы?

### Заданне 1

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння вашага праекта пра мясцовыя стравы.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: кніга рэцэптаў «Мясцовыя стравы».**

### Заданне 2

1. Прачытайце тэкст. Пра якія лясныя дары апавядаецца ў тэксце?

А грыбы! Я, калі за тымі стругамі кантаваўся, пасля доўгай зімы толькі і чакаў, каб хутчэй грыбочкі палезлі. Яны мяне і ратавалі не раз. Ад галадухі. Навучыўся і як абыходзіцца з імі. Браў усялякія — нават дажджавіка, каторага ў нас порхаўкай называюць, нават парасоніка, што чорным мухаморам клічуць, не кажучы пра сморчкоў. Усе яны смачныя, усе былі даспадобы мне. Але найлепей любіў рыжыкі. Натрапіш іншы раз на сямейку — усю зрэжаш і адразу на ражончык ды на касцярок. Спякуцца, солькаю трошкі пасыплеш і давай малоць, давай малоць. За мілую душу ішлі і без хлеба! Навучыўся і з ваўнянак рыжыкі рабіць. Адбяру маладзенькіх ваўняначак, якія яшчэ не растапырыліся, не развярнуліся, адвару ў чыгунку, салью жыжку, яшчэ раз адвару — і, як тыя рыжычкі, наніжу на ражончык і пяку над агнём. Каб не ведаў, што гэта ваўнянкі, то і не сказаў бы. Рыжыкі і ўсё! Не жыў без грыбоў і позняй восенню, нават зімою. У нашых лясох, асабліва дзе ліпа, ясень, вярба, сустракаюцца зімовыя апенькі — чысценькія, мядовага колеру грыбы. Растуць звычайна на параненым камлі, на пні, на маразабоіне. Снегу, бывала, на калені наваліць, а ты лазіш па ліпніку і збіраеш у шапку тыя зімовыя апенькі. Добра яны і ў суп ідуць, і на ражончык *(Паводле Яраслава Пархуты «Адзінец»).*

2. Знайдзіце ў тэксце незнаёмыя вам грыбы. Пры дапамозе інтэрнэт-крыніц складзіце іх апісанне.
3. Раскажыце пра ўлюбёную страву героя Яраслава Пархуты.

### Заданне 3

Цікавую і надзвычай важную інфармацыю пра стравы мясцовай кухні, а таксама традыцыі іх спажывання, тэхналогію гатавання можна даведацца і з размовы з бабуляй. Запоўніце табліцу 7, выкарыстоўваючы інфармацыю пра мясцовыя стравы, атрыманую ў ходзе інтэрв'ю з бабуляй.

*Табліца 7*

**Мясцовыя стравы**

| Назва стравы | Прадукты | Рэцэпт |
|---|---|---|
| | | |

### Заданне 4

Успомніце, якія стравы нацыянальнай кухні гатуе дома маці. Складзіце іх пералік.

### Заданне 5

Як вядома, беларуская нацыянальная кухня фарміравалася на працягу некалькіх стагоддзяў. Набыўшы сваю самабытнасць і ўнікальнасць, яна ўвабрала ў сябе асаблівасці страў іншых народаў. Таму некаторыя стравы сёння можна сустрэць як у беларускай, так і літоўскай, рускай, польскай, украінскай кухнях. Парамі запішыце беларускія традыцыйныя стравы і іх адпаведнікі ў літоўскай нацыянальнай кухні:

Халаднік — шалцібаршчай.
Кішка — ... .
Капыткі беларускія — ... .
Шупеня — ... .

### Заданне 6

1. Прачытайце тэкст. Да каго на вячэру патрапіў галоўны герой аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха»?

Вячэра цягнулася далей. Дубатоўк прапаноўваў то «бліны з мачанкаю», то «надзвычайныя штонікі з мясам, так і плаваюць у масле, святыя такіх не елі». Хутка на маім блюдзе ляжаў вялізны гусь з брусічным варэннем, індыковая ножка з яблыкамі, салёныя грыбы, дзесятак калдуноў, а з усіх бакоў толькі і чутна было:

— А вось пампушкі з часнаком... А вось, пане, кавалак шыначкі дзікага япрука, наперчаны, агнём гарыць. Памяццю маці заклінаючы — вазьміце... А вось цудоўная... А вось незвычайны...

— Вось як у нас па-беларуску частуюць, — рагатаў гаспадар, пабачыўшы, што я зусім разгубіўся.

Перада мною вырасла гара. Я паспрабаваў пратэставаць, але выклікаў такі выбух абурэння (у аднаго з гасцей нават слёзы пацяклі; праўда, ён быў трохі нападпітку), што я здаўся.

— А гэта што? — спытаў я, торкаючы відэльцам у нешта цёмнае на талерцы.

— Каханенькі ты мой, гэта ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце. Еш, браце, сілкуйся. Гэта страва для волатаў. Продкі нашы, зямля ім пухам, не дурныя былі. Еш, абавязкова іх еш.

А праз хвіліну, забыўшыся, што рэкамендаваў «губы», крычаў:

— Не, браце, ты ў мяне адсюль, не пакаштаваўшы халодных пірагоў з гусінай пячонкай, не пойдзеш *(Паводле Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха»)*.

2. Падбярыце ілюстрацыі да шляхецкай вячэры, адлюстраванай у тэксце.
3. Карыстаючыся даведачнымі выданнямі або інтэрнэт-крыніцамі, а таксама матэрыяламі вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» (5 клас), складзіце тэхналагічную карту стравы «Ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце» (табл. 8).

*Табліца 8*

**Ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце**

| | |
|---|---|
| Абсталяванне | |
| Прадукты | |
| Паслядоўнасць гатавання | |

## Заданне 7

1. Прачытайце тэкст. Дзе, на вашу думку, ён быў надрукаваны?

Прадаў на рынку кабана, пайшоў закусіць. З'еў тры міскі капусты з боханам хлеба, сала хатняга з фунт. Тут купіў яшчэ тры порцыі смажанай каўбасы ды ўмяў. Пасля бульбы змамоніў міскі тры. Зноў баршчу міску ўбіў з булкай. А пасля як успомніў, што брат у салдатах, то як завязала *(Паводле Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі»).*

2. Чаму, на вашу думку, пры ўспаміне пра свайго брата ў літаратурнага героя прапаў апетыт? Абгрунтуйце свой адказ.
3. Складзіце слоўны партрэт героя тэксту, карыстаючыся «Слоўнікам эпітэтаў беларускай мовы».
4. Складзіце меню абеду героя тэксту.
5. Важна падлічыць колькасць прадуктаў, неабходных для гатавання стравы. Запоўніце табліцу 9. Пры неабходнасці выкарыстайце даныя інтэрнэт-крыніц.

*Табліца 9*

**Страва героя тэксту**

| Страва | Колькасць порцый | Аб'ём порцыі ў мілілітрах/грамах |
|---|---|---|
| | | |

## Заданне 8

Уявіце, што да вас завіталі далёкія сваякі, якія ніколі не былі ў Беларусі. Акрамя культурнай праграмы па знакамітых беларускіх мясцінах, якую вы для іх падрыхтавалі, вам хацелася б пачаставаць іх стравамі беларускай кухні.

1. Чым вы іх здзівілі б? Складзіце меню беларускай кухні на сняданак, абед і вячэру.
2. Падрыхтуйце спіс прадуктаў і патрэбнага абсталявання, неабходных для гатавання гэтых страў.
3. Падлічыце, колькі грошай спатрэбіцца для пакупкі прадуктаў.
4. Падлічыце час, неабходны для гатавання сняданку, абеду і вячэры.

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з'яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Падрыхтоўка кнігі рэцэптаў «Мясцовыя стравы».

**V. Прэзентацыя праекта.** Гатаванне стравы, прапанаванай у кнізе рэцэптаў «Мясцовыя стравы», у кабінеце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне».

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Што новага вы даведаліся пра стравы нацыянальнай кухні?
- Якое ўяўленне складаецца пра беларускі народ (звычаі, духоўныя традыцыі, гаспадарча-бытавы ўклад, веды, мясцовую экалогію, сацыяльны стан) пры знаёмстве з яго стравамі?
- Якія якасці з пералічаных найбольш уласцівыя для вас асабіста? Абгрунтуйце свой адказ.

# Модуль 5. На ўсё свае песні: на веселлі вясельныя, а на хрысцінах хрысцінныя

Піце з чыстай крыніцы, з напеваў матчыных…
Паважайце, любіце бацькоўскую спадчыну —
Усё сплыве, а легенды і песні застануцца.

*Уладзімір Караткевіч.*

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Ці ўдзельнічалі вы ў якім-небудзь беларускім абрадзе?
- Раскажыце пра цікавы народны абрад, які вы ведаеце. Якое яго прызначэнне? Калі і дзе звычайна праводзіцца гэта свята? Хто яго асноўныя ўдзельнікі?
- Як ахоўваюцца народныя святы і абрады?
- Што мы можам зрабіць для захавання мясцовых народных свят і абрадаў?

**Заданне 1**

1. Як вы ведаеце, святы і абрады суправаджаюць чалавека на працягу ўсяго жыцця: пры нараджэнні, вучобе, працы, змене пораў года.

2. Пазнаёмцеся з малюнкам 49. Дапішыце назвы народных свят, якія вы ведаеце, і злучыце з адпаведнымі сектарамі пораў года.



*Вясна:* … *Лета:* … *Восень:* … *Зіма:* …

*Мал. 49.* Юлія Мацура. «Паміж вясной і зімой»

3. Прачытайце назвы найбольш распаўсюджаных беларускіх абрадаў і свят. Як і ў папярэднім заданні, суаднясіце іх з адпаведнымі порамі года.

Жаніцьба Цярэшкі, Масленіца, Дажынкі, Купалле, Выкуп нявесты, Гуканне вясны, Каляды, Грамніцы, Дзяды, Саракі, Камаедзіца, Сёмуха, Вербніца, Юр'я, Багач, Пахаванне Маланкі, Шчадрэц, Жаніцьба Коміна, Ваджэнне Куста, Провады Русалкі, Пахаванне Дзеда, Свяча.

*Падагульненне*

— Што дае нам вывучэнне народных абрадаў мясцовасці?

— Вызначце, якому народнаму абраду або святу будзе прысвечаны наш праект. Растлумачце свой выбар.

**II. Збор інфармацыі пра народныя абрады і святы мясцовасці.**

Існуе шмат разнастайных крыніц, дзе можна знайсці звесткі пра народныя абрады і святы мясцовасці. Вось некаторыя з іх:

1. Анталогія беларускай народнай песні / укладанне і каментарыі Г. І. Цітовіча. — Мінск : Беларусь, 1968. — 558 с.
2. Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–26 крас. 2015 г. / рэдкал. : В. Р. Языковіч (адказны рэдактар) [і інш.]. — Мінск : БДУКМ, 2015. — 259 с.
3. Беларускія народныя абрады / склад. і навук. рэд. Л. П. Касцюкавец. — Мінск : Беларусь, 1994. — 126 с.
4. Беларускі фальклор : легенды і паданні, казкі, прыказкі і прымаўкі. — Мінск : Вышэйшая школа, 2021. — 270, [1] с. — (Бібліятэка школьніка).
5. Белая Русь : легенды, паданні / укл. М. А. Зелянкова. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 303 с.
6. Мажэйка, З. Я. Каляндарна–песенныя, абрадавыя і гульнявыя традыцыі славян у мінулым і сучасным / З. Я. Мажэйка, А. С. Фядосік. — Мінск : Навука і тэхніка, 1988. — 41 с.
7. Сусед-Виличинская, Ю. С. Колядные забавы: методические рекомендации / Ю. С. Сусед-Виличинская, С. А. Карташев. — Витебск : Витебский государственный университет, 2020. — 33 с.
8. Песенны гасцінец: беларускія народныя песні : рэпертуарны зборнік для калектываў мастацкай творчасці / склад. В. Я. Браім. — Мінск : Ковчег, 2022. — 58 с.
9. Сямейныя абрады і звычаі / Т. Б. Варфаламеева. — Мінск : Вышэйшая школа, 2017. — 719 с.
10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агульнае рэдагаванне : Т. Б. Варфаламеева. — Мінск : Вышэйшая школа, 2001–2013.
11. Фалькларыстыка. Веснавыя песні: поўнач — поўдзень : дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1–21 05 01 «Беларуская філалогія (па напрамках)», 1–21 05 02 «Руская філалогія (па напрамках)», 1–21 05 04 «Славянская філалогія» / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. — Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 2020. — 238 с.

— Якія з прапанаваных крыніц могуць вам дапамагчы знайсці інфармацыю пра народныя абрады і святы мясцовасці?

**Заданне 2**

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння вашага праекта пра народныя абрады і святы мясцовасці.

**Заданне 3**

Адной з крыніц інфармацыі па беларускіх абрадах можа стаць інтэрв'ю са старэйшымі людзьмі. Складзіце пералік пытанняў, якія вы задалі б старажылам вашай мясцовасці адносна традыцый абыходжання абраду, якому будзе прысвечаны ваш праект.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: музычна-тэатральнае дзеянне «Мясцовы абрад».**

**Заданне 4**

1. Прачытайце тэкст. Што сабой сімвалізуе страла і лялька?

На Беларусі ёсць свята «Пахаванне стралы». Яно адзначаецца на шостым тыдні пасля Вялікадня. Стралу, самую першую веснавую маланку, вельмі грозную і непрадказальную сілу, якая забівае і спальвае, з пашанаю ў нас хаваюць на ўзмежку жытняга поля. Адна з дзяўчат выкопвае яму, кладзе туды ляльку, усе закопваюць і спяваюць рытуальныя песні: «Ты не ўбі, страла, добра молайца». А да гэтага сорак дзён яе ўлашчваюць карагодамі, тымі ж песнямі: «Як пушчу стралу дай па ўсём сялу». Такога абраду — Пахаванне маланкі — няма больш нідзе ў свеце *(Паводле Янкі Сіпакова «Зялёны лісток на планеце зямля»)*.

2. Выкажыце меркаванне: у чым сэнс абраду «Пахаванне стралы»?
3. Карыстаючыся інфармацыяй з інтэрнэт-крыніц, даведайцеся пра рэгіён бытавання абраду «Пахаванне стралы». Пералічыце вёскі, у якіх рэгулярна ладзіцца гэты абрад.
4. Дапоўніце інфармацыю тэксту дадатковымі данымі пра асаблівасці правядзення абраду, выкарыстання розных прадметаў, удзелу дзяцей у ім.
5. Карыстаючыся інфармацыяй, складзіце кароткі сцэнарый абраду «Пахаванне стралы».
6. Як вынікае з тэксту, абрад «Пахаванне стралы» з'яўляецца ўнікальнай з'явай не толькі для культуры Беларусі, але і для сусветнай культуры. Ён знаходзіцца пад аховай нашай дзяржавы, яго плануюць уключыць у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА. Якія аб'екты, што знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, уваходзяць у спіс матэрыяльнай і духоўнай спадчыны ЮНЭСКА?

**Заданне 5**

1. Знайдзіце ў інтэрнэт-прасторы відэафрагмент абраду «Юр'еўскі карагод». У вёсцы якой мясцовасці адбываецца абрад? Што на гэта ўказвае? Абгрунтуйце свой адказ.
2. Знайдзіце інфармацыю пра павер'і і прыкметы, звязаныя з Юр'евым днём.
3. На аснове відэафрагмента складзіце сцэнарый абраду «Юр'еўскі карагод».

## Заданне 6

Уявіце, што вы працуеце на тэлебачанні рэквізітарам. Якраз рыхтуецца праект пра народныя традыцыі Гомельшчыны, дзе абавязкова будзе прадстаўлены абрад «Юр'еўскі карагод». Складзіце пералік усяго неабходнага для здзяйснення гэтага абраду. Запоўніце табліцу 10. Пры неабходнасці дапоўніце яе дадатковай інфармацыяй.

*Табліца 10*

**Абрад «Юр'еўскі карагод»**

| Рэквізіт, неабходны для правядзення самога абраду | Назвы спеваў | Музычныя інструменты | Вопратка | ... |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

## Заданне 7

1. Прачытайце сцэнарый. Падбярыце да яго назву.

*Двор. Выходзіць гаспадар.*

**Гаспадар.** Як хораша кругом, а паветра якое, ажно галаву кружыць!

**Сусед.** Добрай раніцы, дзядзька! Са святам вас, з вясною!

**Гаспадар.** Дзякуй, хлопча, за віншаванні, але мяне з адным святам, а цябе, Юрка, з двайным.

**Сусед.** І вам дзякуй, ледзь не забыўся, што гэты дзень — мае імяніны. Нешта ж пастуха доўга няма. Пайду, дапамагу маці, пастаю каля кароў, каб не збеглі.

**Гаспадар.** Ды і я з табою. А вунь і пастух.

*Пастух, ідучы па вуліцы, гучна выкрыквае.*

**Пастух.** Сам святы Юрый на кані едзе,
У трубу іграе, кароў выганяе.
Выганяй, гаспадар, кароўку ды на першую радоўку,
Каб пад сонцам сагрэлася,
Каб травіцы наелася.

**Гаспадар** *(вітаецца з пастухом).* Мая кароўка ўжо на вуліцы. А ты, Лявон, малайчына, што не забыўся на прыказкі, якія даўней казалі, калі ў дзеда ў падпасках бегаў.

**Пастух.** Дзед Мікіта вельмі ж спраўны быў на розныя прымаўкі ды прыказкі. А пугі якія былі, з кутасамі на канцы, «стралялі», як з ружжа! Ну, добра, я пайшоў, няма калі стаяць.

**Гаспадар.** Пачакай, Лявонка, нешта скажу. Па старым звычаі, як рабілі продкі нашы, так і я на кажух поўсцю ўверх паклаў яйка з хлебам і соллю...

**Пастух** *(зацікаўлена).* Пераступіла ці абышла кароўка?

**Гаспадар.** Абышла, разумная. І няхай гэта будзе добрай прыкметай для жывёлы ўсіх гаспадароў. А цяпер шчасліва, Лявонка, з Богам.

*Разыходзяцца.*

**Сусед** *(гукае).* Дзядзька Іван, дзе вы?

**Гаспадар.** Я тут, у двары.

**Сусед.** Прыходзьце бліжэй да абеду з цёткай Верай на свята. Будзем Юр'я гукаць.

**Гаспадар.** Дзякуй. Малайцы, што звычаяў не забываеце, прыйдзем абавязкова.

*Разыходзяцца. З-за бярозак выходзіць прыгожа апранутая дзяўчына з вянком з палявых кветак на галаве. Гэта Вясна.*

**Вясна.** Добрага дня, шчасця, радасці, здароўя ўсім добрым людзям! *(Кланяецца.)* А дзе ж гэта сябры мае маладыя падзеліся? Тыя, што мяне гукалі, вяснянкі спявалі?

*Да Вясны з усіх бакоў збягаюцца хлопцы і дзяўчаты.*

**Дзяўчына.** Дзякуй, Вясна, што на свята да нас прыйшла.

**Вясна.** Мне так спадабаліся вашы песні, танцы, што я хацела б паслухаць іх яшчэ раз дый патанцаваць разам з вамі. Калі ласка, музыкі, зайграйце нам вясёлую «Лявоніху».

*Усе танцуюць.*

**Дзяўчына.** А цяпер, паважаныя, наша дзявочая, веснавая.

*Дзяўчаты спяваюць і водзяць карагод.*

**1-я дзяўчына.** Ой, казала маці кісель памяшаці,
Я не мяшала, я ўсё гуляла.
Ой, лёлі, лёлі, я ўсё гуляла.

**2-я дзяўчына.** Ключы пагубіла, мяне маці біла.
Шукала наўкола, ножкі калола.
Ой, лёлі, лёлі, ножкі калола.

**3-я дзяўчына.** Там напаткала, дзе я скакала,
Ключыкі-замчыкі, мілыя танчыкі.
Ой, лёлі, лёлі, мілыя танчыкі.

**Вясна.** Дзякуй, паважаныя, добра ўмееце і танцаваць, і спяваць. Але сёння не толькі маё свята, яшчэ і Юр'я веснавога. Каб ён прыехаў да нас на белым кані, трэба яго пагукаць. Давайце ўсе разам пагукаем, паўтарайце за мной!

**Усе** *(разам).* Святы Юрый, Божы пасол, да Бога пайшоў,
Ды ўзяў ключы залатыя адамкнуць кладоўкі зямныя.
Адчыніў зямлю сырусеньку, пусціў расу цяплюсеньку.
На ўвесь свет, на ўвесь свет!

*З'яўляецца Юрый на белым кані, у белым строі. На поясе вісяць залатыя ключы. Ён трубіць у пастухоўскі рог.*

**Хлопцы** *(разам).* Святы Юрый, дзе бываў? Што ты бачыў, назіраў?

**Юрый.** Я па полі хадзіў, жыта расціў, бацьку прасіў:
«Радзі, Божа, жыта ды на новае лета, людзям на жыцце».
Я па хатах хадзіў, бацьку прасіў, каб здароўе дарыў, людзям дзяліў.
Я па хлевах хадзіў, бацьку прасіў, каб ваш статак пладзіў ды вам шчасце насіў!

**Усе** *(разам).* Дзякуй, Юрый. Дзякуй за добрыя словы і пажаданні.

*Юрый злазіць з каня. Хлопцы падводзяць каня да бярозы і прывязваюць. Моладзь водзіць карагод і спявае юр'еўскую песню.*

**Усе** *(разам).* Ой, хадзіў Юр'я па ўсёй зямлі, нівы людзям радзіў,
У хаты дзетак насіў. Дзе ні зірне — там шчасце цвіце.
Куды ні гляне — хораша стане. Пусціў расу на маці-зямлю,
Веснавую зелень, траву-мураву.

**Юрый.** Дзякуй за песню. А што сястрыца Вясна вам прынясла? Кажыце, не маўчыце.

**Дзяўчаты.** Вясна-красна нам, дзяўчаткам, прынясла сыру.

**Хлопцы.** А хлопцам кія, Волікаў гнаці.

**Дзяўчаты.** Дзяўчынкам сыру, Вёсенку зваці.

**Хлопцы.** Для хлопцаў пугі, Каровак гнаці.

**Дзяўчаты.** А для нас кветак, вяночкі віці.

**Хлопцы.** Яшчэ плужочкі, Зямлю араці.

**Дзяўчаты.** Для нас сярпочкі, каб потым жаці.

**Вясна.** Дзякуй, што не забыліся на мае падарункі. Іду я сёння пад узгорак, аж бачу, ляжыць мяшэчак скорагаворак. Хто без памылак, а галоўнае, хутка вымавіць, той атрымае ад нас з Юр'ем смачны пачастунак. Слухайце. Тры дрывасекі на трох дварах дружна дровы сякуць.

*Удзельнікі паўтараюць. Вясна ўзнагароджвае салодкімі прызамі. Пад музыку выходзіць карабейнік у нацыянальнай вопратцы з каробкай ласункаў і рознага печыва.*

**Карабейнік** *(весела, гучна).* Паважаныя Вясна, Юрый і ўсе добрыя людзі, дазвольце і мне песню праспяваці, каб тавар добра прадаці.

**Вясна і Юрый** *(разам).* Дазваляем. Спявай.

*Карабейнік спявае на манер «Каробушкі».*

**Карабейнік.** Вам гасцінцы й пачастункі і за грошы, і на прызы,
Свае і заморскія ласункі ў свята Юр'я і Вясны.
Набягайце, расхапайце, што тут грошы шкадаваць!
Усё ўмомант раскупляйце, пасля пойдзем танцаваць.
Абаранкі й шакалады, ззяе ярка апельсін,
Усім цудоўныя прынады, набірайся, дружа, сіл!

**Вясна.** Малайчына, карабейнік, добрую рэкламу даў свайму тавару.

**Юрый.** Зараз усё і раскупяць.

**Карабейнік** *(весела).* Самае смачнае засталося на прызы. Дый скорагаворка ў мяне таксама ёсць. Правучыць сароку — адна марока, сорак сарок — сорак марок.

**Хлопец.** Можна я?

**Вясна.** Паўтарай.

*Хлопец спрабуе паўтарыць.*

**Вясна.** І апошняя. Ткач тчэ тканіну на хустку Анікіне.

**Вясна.** Так, чакаю самых гаваркіх.

*Удзельнікі паўтараюць і атрымліваюць гасцінцы.*

**Дзядзька.** А яшчэ дазвольце сказаць слова трапнае наконт свята, як казалі калісьці нашы продкі.

**Вясна.** З задавальненнем паслухаем.

**Дзядзька.** Юр'ева раса, не трэба каню аўса. Як дождж на Юр'я, то будзе хлеб і ў дурня. Калі прыйдзе Юрый, не ўгледзіш у жыце куры!

**Юрый.** Вялікі вам дзякуй за добрую сустрэчу ды за пашану. *(Да моладзі.)* А давайце пагуляем.

**Хлопец.** Давайце ў «Пастуха і Ваўка».

**Вясна.** Цікава, расказвай, як у яе гуляць. Трэба выбіраць, мабыць, «Пастуха» і «Ваўка».

**Хлопец.** Правільна. «Пастух» становіцца спераду, а ўсе астатнія за ім, моцна трымаюць адно аднаго за пояс. «Воўк» падыходзіць да «Пастуха» і пачынаецца размова:

— Ты хто?
— Пастух.
— А што робіш?
— Коней пасу.
— А навошта?
— Каб лепш араць.
— Араць, араць, мне б хоць аднаго дастаць!

«Воўк» кідаецца да апошняга з «коней». Пастух стараецца не дапусціць гэтага. Злоўлены ў гульні не ўдзельнічае. «Воўк» імкнецца пералавіць увесь «табун».

*Праводзіцца гульня.*

**Юрый.** А цяпер салодкі прыз атрымае той, хто адгадае, як называецца мой любімы танец. Думайце, называйце, цукеркі зарабляйце.

*Удзельнікі прапаноўваюць назвы танцаў.*

**Дзяўчына.** Гэты танец, напэўна, мае назву «Юрачка».

**Юрый.** Дзякуй, вось твой прыз. А цяпер, музыкі, зайграйце нам «Юрачку».

*Гучыць мелодыя танца, моладзь танцуе і спявае.*

**Усе** *(разам).* Ой, ты, Юрачка, што не жэнішся?
Прыйдзе зімачка, дзе падзенешся?

**Юрый.** А я ў сад пабягу, я схаваюся,
Дзеўкі есці прынясуць — развітаюся.

**Вясна** *(пасля танца).* Са святам Юр’я вас вітаем. Шчасця, здароўя, даўгалецця жадаем!

**Юрый.** Дай жа, Божа, усім добрае жыцце! Жывіце заўсёды ў дабрабыце! Яшчэ нас з Вясною дарога чакае, мы пойдзем далей па родным краі.

*Вясна і Юрый кланяюцца. Вясна адвязвае каня, і яны пад музыку спускаюцца з узгорка. Усе разыходзяцца (Паводле Алены Маскевіч «Святы Юр’я, устань рана!»).*

2. Што новага прыўнесена аўтарам сцэнарыя у абрад «Юр’еў карагод»?
3. Выразна прачытайце сцэнарый па ролях.
4. Паспрабуйце рэканструяваць гульню, выкарыстаную ў сцэнарыі народнага свята.
5. Падбярыце музычны матэрыял для танцаў і спеваў.

### Заданне 8

1. Як вы заўважылі, ніводны народны абрад не адбываецца без прыгожых спеваў.
2. Праслухайце песню «У печы палю» (або «Юрачка»).
3. Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны?

Ў печы палю, бульбу вару,
А на печы гарох пару.
Во ха! Во ха-ха! Бедна ж мая галава!

На печ ўзлезу, гарох зніму,
Не лезь, Грышачка, бо скіну.
Во ха! Во ха-ха! Бедна ж мая галава!

Як удару не памалу,
Дык пакоцішся на лаву.
Во ха! Во ха-ха! Бедна ж мая галава!

Каля кузенькі ішла,
Малаточак я знайшла.
Во ха! Во ха-ха! Бедна ж мая галава!

А мой Грыша кавалёчак, —
Вазьмі сабе малаточак.
Во ха! Во ха-ха! Бедна ж мая галава!

4. Да якога жанру можна аднесці тэкст песні «У печы палю»? Выкажыце меркаванне пра тое, у якім месцы абраду «Юр'еў карагод» песня можа быць выкарыстана.

5. Развучыце песню «У печы палю».

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з'яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Падрыхтоўка музычна-тэатральнага дзеяння «Мясцовы абрад».

**V. Прэзентацыя праекта.** Музычна-тэатральнае дзеянне «Мясцовы абрад» можа быць прадстаўлена на творчых мерапрыемствах установы адукацыі.

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Што новага для сябе вы даведаліся пра мясцовыя абрады?
- У чым праяўляецца самабытнасць мясцовага абраду, якому прысвечаны ваш праект?

# 2-і ГОД НАВУЧАННЯ

# Модуль 6. Добрая дарога — карацейшы шлях

Ёсць у нашай краіны ад дзён яе раніцы
Дарагія мясціны, дзе шапка здымаецца.
*Максім Лужанін.*

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Якія краязнаўчыя і патрыятычныя акцыі, накіраваныя на вывучэнне гістарычных, культурных і духоўных традыцый беларускага народа, вы ведаеце?
- Якія з краязнаўчых мерапрыемстваў праводзяцца ў вашай установе адукацыі?
- Ці ўдзельнічалі вы ў краязнаўчых мерапрыемствах? Раскажыце пра іх вынікі.
- Назавіце краязнаўчыя аб'екты вашай мясцовасці (прыродныя, гістарычныя, культурныя), што выклікаюць у вас інтарэс. Чым яны адметныя?
- Якое значэнне гэтыя краязнаўчыя аб'екты маюць для вашага рэгіёна?

### Заданне 1

Суаднясіце галоўныя напрамкі краязнаўчай работы з іх тлумачэннямі (табл. 11).

*Табліца 11*

**Напрамкі краязнаўчай работы**

| Напрамкі краязнаўчай работы | Змест напрамкаў краязнаўчай работы |
|---|---|
| вывучэнне прыродных асаблівасцей мясцовасці | вывучэнне гісторыі краю, даследаванне археалагічных і гістарычных помнікаў, вывучэнне лёсу вядомых людзей |
| вывучэнне гістарычных асаблівасцей мясцовасці | геалагічная будова, рэльеф, унутраныя воды, раслінны і жывёльны свет, праблемы аховы прыроды |
| вывучэнне культурных асаблівасцей мясцовасці | вывучэнне матэрыяльнай (збудаванні, прылады працы, адзенне, нацыянальная кухня) і духоўнай культуры (літаратура, фальклор, мастацтва, традыцыі і звычаі) |

*Падагульненне*

— Чаму неабходна вывучаць і даследаваць свой край? Арганізоўваць школьныя музеі або праводзіць асветніцкую работу?

— Вызначце, стварэнню якога экскурсійнага маршруту будзе прысвечаны наш праект. Растлумачце свой выбар.

**ІІ. Збор інфармацыі па экскурсійным маршруце мясцовасці.**

Для збору інфармацыі карыснымі будуць навуковая, гістарычная, мастацкая, навукова-папулярная, даведачная літаратура з фондаў бібліятэк і архіваў; матэрыялы краязнаўчых, гістарычных, літаратурных, школьных музеяў; інтэрнэт-рэсурсы; копіі дакументаў, гістарычныя карты, старыя і сучасныя фотаздымкі, матэрыялы рэгіянальных газет; серыя кніг «Падарожжа па родным краі», матэрыялы часопісаў «Мастацтва», «Беларускі гістарычны часопіс “Беларусь”», «Родная прырода»; газет «Літаратура і мастацтва», «Культура» і інш., а таксама сустрэчы з людзьмі, якія могуць падзяліцца ўласнымі ўспамінамі.

Існуе шмат разнастайных краязнаўчых крыніц. Вось некаторыя з іх:


1. Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993. — 620 с.
2. Белая Русь : легенды, паданні / укл. М. А. Зелянкова. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 303 с.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : у 7 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 1984–1988.
4. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць : навукова-папулярныя эцюды / В. П. Лемцюгова. — Мінск : Литература и искусство, 2088. — 416 с.
5. Несцярчук, Л. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны : кніга-альбом / Л. Несцярчук. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — 429, [1] с.
6. Памяць: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі ў 151 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1985–2015.
7. Рогалеў, А. Ф. Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі) / А. Ф. Рогалеў. — Гомель : Барк, 2008. — 216 с.
8. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2004.
9. Энцыклапедыя «Культура Беларусі». — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2010–2015.


— Якія з прапанаваных крыніц могуць вам дапамагчы падрыхтаваць экскурсійны маршрут мясцовасці?

**Заданне 2**

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння вашага праекта пра народныя абрады і святы мясцовасці.

**ІІІ. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: экскурсійны маршрут «Па мясцовых славутасцях».**

**Заданне 3**

1. Прачытайце тэкст пра Нёман. Да якога жанру вуснай народнай творчасці яго можна аднесці?

### Як нарадзіліся Нёман і Лоша

Даўным-даўно, тысячы гадоў назад, з-пад вялізнага каменя, дзе б’е крыніца, нарадзіўся славуты асілак. Яго назвалі Нёманам. Жыў сярод лясоў дрымучых, лугоў шырокіх. Прыгожы, працавіты. Прыродзе, і людзям, і ўсяму жывому дабром плаціў. У суседстве жыла Лоша. Гультаяватая, ляжала ў цяньку, сабою любавалася. Нікому ад яе не было ні радасці, ні карысці. Лоша часта заглядала да свайго суседа. За маўклівасць называла яго Неманцом.

Цяпер ніхто і не ведае, што Нёману спадабалася тая красуня. Адно вядома — было вяселле. Гуляла на ім уся жаніхова радня: і Сула, і Уса, і Уздзянка, і Шчара... Каго толькі тут не было! Пілі, балявалі, маладым шчасця ды добрай долі жадалі. Скончылася вяселле, пачаліся будні.

Зноў Нёман не ведаў ні дня, ні ночы. Паіў, карміў, туліў усіх, хто да яго гарнуўся: і чалавека, і звера, і птаха, і рыбу, і жыўнасць усякую. Цешыў сваім люстэркам водным прыбярэжныя лясы, палеткі, лугі, на сваіх магутных грудзях насіў чоўны, ганяў плыты.

Не раз запрашаў на шырокую прастору і сваю красуню ненаглядную. Толькі тая была абыякавая, халодная да ўсяго, па-ранейшаму не хацела дзяліць са сваім волатам нягоды і радасці.

Не па душы было такое жыццё Нёману. Аднойчы цёмнай ноччу кінуўся ўпрочкі. Старaўся замесці след: там пад паплавам прабяжыць, там дзеля перадыху вынырне плёсам, тоняй, азярынкаю, а затым зноў схаваецца. І толькі там, дзе цяпер Забалацце стаіць, асілак у адкрытую пайшоў да мора.

Прачнулася Лоша, а Нёмана няма. Пачала даганяць уцекача, ды не ў той бок кінулася. Па далінах ды па нізінах бегла. Ажно сіл не ставала, дый не ведала, куды лепей падацца. Гукала-клікала на дапамогу, але ніхто не прыйшоў: ні Пціч, ні Бярэзіна, ні Свіслач... Толькі Выня паспачувала гору сваёй сяброўкі. Выбеглі яны ўдзвюх да груда пясчанага, дзе сягоння Пясочнае, і ўбачылі: Нёман праз долы і лясы дарогу сабе пракладае. Хвалямі горкіх слёз кінулася Лоша ў абдымкі да свайго асілка: адчула, жыць па-ранейшаму ды яшчэ адной заставацца не варта — знікнуць можна. Пачала дапамагаць Нёману. З часам і людзі не абмінулі яе стараною: паблізу пачалі будавацца. Так нарадзіліся вёскі Лоша, Мрочкі, Перавоз, Сасноўка, Рачыца, Пясочнае.

Нёман ніколі не забывае родныя мясціны. Кожную вясну, кожную восень дажджлівую вяртаецца да маці сваёй — крынічкі, якая цячэ з-пад вялізнага каменя. Вяртаецца сюды, каб сустрэцца са сваёй Лошаю, са сваёй маладосцю *(Паводле невядомага айчыннага аўтара).*

2. Якія метафарычныя мастацкія вобразы выкарыстоўвае аўтар у тэксце?
3. Ахарактарызуйце вобразы рэк Нёмана і Лошы.
4. Карыстаючыся інтэрнэт-крыніцамі, пашукайце іншыя легенды пра раку Нёман. У сшытак сцісла запішыце невялікі тэкст пра найбольш яскравую і прыгожую легенду.
5. Карыстаючыся контурнай картай («Геаграфія Беларусі» (9 клас)), знайдзіце асноўныя прытокі Нёмана. Карыстаючыся даведачнай інфармацыяй, складзіце спіс прытокаў Нёмана, размяшчаючы іх па абласцях Беларусі (табл. 12).

*Табліца 12*

**Прытокі Нёмана**

| Прыток Нёмана | Вобласць працякання | Раён працякання |
|---|---|---|
| Зазулька | Гродзенская | Шчучынскі<br>Мастоўскі |
| | | |

6. Чаму Нёман лічаць нашым нацыянальным гонарам, нашай гісторыяй, Бацькаўшчынай, надзеяй і будучыняй краіны? Абгрунтуйце свой адказ.

## Заданне 4

1. Складзіце пералік вадаёмаў вашага рэгіёна і запоўніце табліцу 13.

*Табліца 13*

**Вадаёмы мясцовасці**

| Назва вадаёма (ракі, возера) | Агульная даўжыня | Даўжыня ў межах рэгіёна | Дадатковая інфармацыя (напрыклад, флора, фаўна; суседства з іншымі краінамі) |
|---|---|---|---|
| | | | |

2. Складзіце характарыстыку ракі вашага рэгіёна. Даныя занясіце ў табліцу 14.

*Табліца 14*

| | |
|---|---|
| Назва ракі | |
| Выток | |
| Даўжыня (агульная і, калі вядома, на тэрыторыі вашага раёна) | |
| Назвы населенных пунктаў, дзе працякае рака | |
| Прытокі | |
| Вусце | |
| Гаспадарчае выкарыстанне | |
| Экалагічны стан | |

## Заданне 5

1. Прачытайце тэкст. Якія з гістарычных аб’ектаў Ракава вас зацікавілі?

**Ракаў**

Мястэчка і ўладанні над ракой Ісляччу, левым прытокам Бярэзіны, у Мінскім павеце, ля гандлёвага шляху з Мінска ў Пяршаі да Валожына і далей у Ашмянскі павет, на пясчанай раўніне ў атачэнні маляўнічага наваколля, у 2-й паліцэйскай акрузе і воласці, Ракаў знаходзіцца за 18 вёрстаў ад станцыі Радашковічы Лібава-Роменскай чыгункі і за 15 міляў ад Мінска.

Пра тое, што месца гэтае было заселена яшчэ ў дагістарычны час, сведчыць добра захаванае гарадзішча побач з памешчыцкім дваром, а таксама не менш велічэзны курган у разліве р. Ісляч і крамянёвыя прылады, якія знаходзяць на беразе гэтай ракі.

Гарадзішча месціцца сярод гаеў, насыпана на 18 футаў над узроўнем лугоў і мае форму крыху падоўжанай падковы, звужанай з паўночнага боку, дзе знаходзіцца ўваходнае паглыбленне. Даўжыня насыпу складае 110 локцяў, шырыня — 50 локцяў. На яго паўднёвым канцы ёсць пляцоўка з выразнымі рэшткамі мураванага ахвярнага алтара, ўсярэдзіне ўсё гарадзішча абнесена валам, які ўзнік у выніку абкапвання гэтага месца ровам шырынёй у дзесяць з лішкам крокаў, які, верагодна, запаўнялі вадой з бліжэйшай рэчкі, таму гарадзішча было адначасова і абаронча месцам *(Паводле Аляксандра Ельскага «Ракаў»)*.

2. Назавіце гістарычныя аб'екты, пра якія ўзгадваецца ў тэксце, што захаваліся да сённяшняга дня.

3. На аснове тэксту складзіце схематычны план гарадзішча і аб'ектаў, змешчаных у ім. Выкарыстоўваючы разнастайныя інфармацыйныя рэсурсы, падбярыце ілюстрацыі да гарадзішча Ракаў.

4. Знайдзіце ў тэксце меры даўжыні, якія раней выкарыстоўваліся ў побыце беларусаў. Выпішыце іх у сшытак, размясціўшы ў парадку памяншэння даўжыні, напрыклад, міля — вярста — … .

5. Перавядзіце гэтыя значэнні даўжыні ў адзінкі вымярэння, якія дзейнічаюць сёння.

6. Якія словы, што сустракаюцца ў тэксце, даўно не выкарыстоўваюцца?

7. Пералічыце прозвішчы мастакоў, музыкантаў, літаратурных дзеячаў і г. д., што паходзяць з аграгарадка Ракаў.

### Заданне 6

Мастака Напалеона Орду ведае, напэўна, кожны беларус. Падчас сваіх вандровак ён зрабіў незлічоную колькасць замалёвак і эцюдаў краявідаў, гарадоў і мястэчак. Для сваёй творчасці ён выбраў тэхніку алоўкавага малюнка, падмаляванага акварэллю, гуашшу або сэпіяй, якой дасканала валодаў. Менавіта гэта тэхніка дазваляла найбольш дакладна адлюстраваць краявіды ва ўмовах падарожжа. Вынікам такіх вандраванняў стаў збор па-над 1150 мастацкіх твораў (мал. 50–51).

1. Знайдзіце ў сетцы Інтэрнэт мастацкія творы Напалеона Орды. Ці адлюстравана ў яго спадчыне ваша мясцовасць?



*Мал. 50.* Напалеон Орда. Бяроза-Картузская



*Мал. 51.* Напалеон Орда. Мірскі замак

2. Падбярыце фотаздымкі вашай мясцовасці, выкарыстоўваючы разнастайныя крыніцы. Да кожнага фотаздымка прыдумайце назву і падрыхтуйце кароткі каментарый (населены пункт, гістарычныя звесткі, апісанне).

### Заданне 7

1. Прачытайце тэкст. Якія прафесіі былі запатрабаваныя на слуцкай мануфактуры па вырабе паясоў?

**Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку**

Аздобай і характэрнай часткай нашага нацыянальнага строю спрадвеку быў пояс, які насілі паверх цёмнага жупана як заможныя класы, так і вясковы люд, а сяляне да сённяшняга дня амаль паўсюдна ўжываюць розныя скураныя і ўзорыстыя

паясы, што з'явіліся ўпершыню, верагодна, у дагістарычнай калысцы Славяншчыны на далёкім Усходзе.

Гэты гандаль, вельмі і вельмі выгадны, прывёў нарэшце да заснавання ў краі фабрык, названых «персіярнямі[1]», першай і найвядомейшай з якіх была слуцкая фабрыка, бо і сапраўды гэтая персіярня, а дакладней ткальня, з пункта гледжання эстэтыкі і майстэрства выканання мае першараднае значэнне ў галіне нацыянальнай мануфактурнай прамысловасці. І калі ў 1878 годзе слуцкія паясы экспанаваліся на сусветнай парыжскай выстаўцы, яны выклікалі захапленне ў замежных знаўцаў, з гэтага часу яны ператварыліся ў прадмет, які іншаземцы расшуквалі для сваіх збораў у якасці твора мастацтва.

Слуцкая персіярня, паводле аўтэнтычных нататак, якія ёсць у мяне, месцілася на вялікім пляцы, дзе сёння знаходзіцца вуліца Шырокая, насупраць кальвінскага пансіёна, побач з вялікім садам. Галоўная фабрыка, якую перасякалі калідоры, мела некалькі павільёнаў.

На гэтай фабрыцы не толькі паясы, але ўсе матэрыі з серабра, золата і шоўку ў розныя ўзоры ў залежнасці ад пажадання вырабляць можна. Усе матэрыялы: шоўк, шоўк для вышыўкі, золата, серабро дастаўляюцца з Гданьска. Шнуры вырабляе тутэйшы пазументнік. А ніці і бёрды вырабляюцца на фабрыцы.

На слуцкай фабрыцы ў 1807 годзе працуюць:
1. Андрэй Гутоўскі, з Галіцыі, для вязання кветак.
2. Тамаш Барсук, шляхціц, пісар.
3. Міхал Баранцэвіч, шляхціц, для навівання шпуль.
4. Сымон Сегень, з Нясвіжа, весці аснову.
5. Ян Івашкевіч, са Слуцка, помочнік.

Пры варштатах[2].
1. Юзаф Барсук, шляхціц.
2. Піліп Дубіцкі, з Урэчча.
3. Міхал Надольскі, з Нясвіжа.
4. Як Канчыла, са Слуцка.
5. Ян Рымашэўскі.
6. Ян Дубіцкі, з Урэчча.
7. Аляксандр Лойка, са Слуцка.
8. Васіль Смяшкевіч, са Свержаня.
9. Фларыян Міхалоўскі, са Слуцка.
10. Кароль Садоўскі, з Белай.
11. Францішак Мушынскі, са Слуцка.
12. Ян Серыкоўскі, са Слуцка.

Цягальшчыкі[3].
1. Павел Кулікоўскі, са Слуцка.
2. Пасхаліч Івашкевіч, са Слуцка.
3. Якуб Канановіч, са Слуцка.
4. Вінцэнт Івашкевіч, са Слуцка.

[1] Персіярня — майстэрня, або мануфактура, дзе выраблялiся шаўковыя паясы і тканіны. У XVIII стагоддзі яны існавалі ў Слуцку, Гродне, Альбе (пад Нясвіжам). Спачатку паясы ткалі на ўзор персідскіх (адсюль назва), пазней выкарыстоўвалі мясцовыя матывы.

[2] Варштатам называлі ткацкі станок.

[3] Цягальшчыкі — майстры, якія выконвалі спецыяльныя аперацыі на ткацкіх станках.

5. Юзаф Свянціцкі, са Слуцка.
6. Раман Вархан, са Слуцка.
7. Піліп Талкачэвіч, са Слуцка.
8. Пётр Зянькевіч, са Слуцка.
9. Міхалоўскі, са Слуцка.
10. Андрэй Чайкоўскі, са Слуцка.
11. Сымон Сянькевіч, са Слуцка.
12. Якуб Вайцяхоўскі, са Сёлка.

Craляр: Казімір Сымановіч, са Слуцка.

Сёння слуцкія паясы ўжо рэдкасць, і абавязак людзей разумных, якія любяць айчынную гісторыю, — ратаваць іх рэшткі, раскіданыя па ўсім краі.

Была нават хвіліна, калі нашыя агідна марнатраўныя пані па-варварску рэзалі на кавалкі багатыя слуцкія паясы дзеля таго, каб аздобіць свае раскошныя туалеты. Мне дакладна вядома, што неаднойчы фамільныя паясы пераплаўляліся на серабро на выраб начыння для сталовых сервізаў. Я сам маю такі, вагой больш за 6 фунтаў, з серабра, пераплаўленага са слуцкіх паясоў. Гэта вынік выраджэння духу, дурноты, часткова недарэчнай боязі, вынік пыхлівасці, жаданне мець на стале серабро.

У сапраўдных старых памешчыцкіх дамах і сёння яшчэ з належнай пашанай захоўваюцца слуцкія паясы. Іх збіраў вучоны граф Канстанцін Тышкевіч для свайго музея ў Лагойску (Барысаўскі павет), іх маюць князі Радзівілы з Паланэчкі (Наваградскі павет), але найкаштоўнейшым і самым вялікім зборам слуцкіх паясоў валодае вядомы нумізмат граф Эмерык Чапскі ў сваім выдатным музеі ў Станькаве (Мінскі павет) *(Паводле Аляксандра Ельскага «Гістарычныя звесткі пра радзівілаўскую ткальню паясоў у Слуцку»).*

2. Праслухайце песню Уладзіміра Мулявіна «Слуцкія ткачыхі» на словы Максіма Багдановіча. Знайдзіце галоўную неадпаведнасць паміж вершам Максіма Багдановіча і інфармацыяй з тэксту Аляксандра Ельскага. Як вы можыце гэта растлумачыць?

3. Што яшчэ, акрамя паясоў, ткалі на слуцкай мануфактуры? Дапоўніце свой адказ іншымі данымі, што не сустракаюцца ў тэксце Аляксандра Ельскага.

4. Пазнаёмцеся з кроснамі на краязнаўча-інфармацыйным партале (http://www.gants-region.info). Запішыце ў сшытак тэхналогію працы кроснаў у сціслай форме.

5. Знайдзіце 5 цікавых фактаў пра слуцкую персіярню.

6. Дзе сёння можна сустрэць выявы слуцкіх паясоў? Як у беларускай культуры, побытавым свеце прадстаўлена тэма слуцкіх паясоў? Падбярыце мастацкія прыклады.

7. Чаму слуцкія паясы лічацца сімвалам Беларусі?

8. Складзіце невялікае і ёмістае паведамленне пра аднаго з названых у тэксце беларускіх дзеячаў.

### Заданне 8

Падрыхтуйце паведамленне пра вашу мясцовасць па наступным плане:

– гісторыя;

– гістарычныя падзеі на тэрыторыі рэгіёна;

– лёс у гады Вялікай Айчыннай вайны;

– геаграфічнае становішча, знешні воблік паселішча, асаблівасці навакольнай мясцовасці;

– назвы рэк;
– насельніцтва, заняткі жыхароў;
– імёны і прозвішчы людзей;
– помнікі гісторыі, культуры;
– асаблівасці транспартных шляхоў;
– … .

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з'яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Складанне экскурсійнага маршруту «Па мясцовых славутасцях».

**V. Прэзентацыя праекта.** Экскурсійны маршрут «Па мясцовых славутасцях» можа быць рэалізаваны ў межах пазакласнай дзейнасці вучняў іншых класаў, іншых устаноў адукацыі (у тым ліку і ва ўстановах дашкольнай адукацыі).

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Што вас асабліва зацікавіла?
- Што вы ўзялі для сябе са знаёмства з мясцовай славутасцю, якой прысвечаны ваш праект?
- Ацаніце свой эмацыянальны стан да пачатку праекта і пасля яго.

# Модуль 7. Добрая слава далёка чуваць

> Чалавек жыве дзеля дабра, для служэння праўдзе, каб ствараць нейкія вартасці жыцця і каб быць карысным для іншых.
>
> *Якуб Колас.*

**I. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Каго з вядомых вам асоб беларускай гісторыі і культуры, навукі, адукацыі, сучаснай вытворчасці вы лічыце знакамітымі?
- Прачытайце тлумачэнне слова «знакаміты».

З інфармацыі «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» слова «знакаміты» абазначае «шырока вядомы, славуты».

- З якімі назоўнікамі, на вашу думку, можа спалучацца прыметнік «знакаміты»?
- Навошта нам трэба вывучаць жыццё і творчасць знакамітых асоб?
- Як людзі ўшаноўваюць памяць пра знакамітых асоб? Прывядзіце прыклады ўшанавання памяці знакамітых асоб.
- Ці можам мы што-небудзь зрабіць для таго, каб ушанаваць іх памяць?

**Заданне 1**

1. Вызначце характарыстыкі, па якіх можна меркаваць пра тое, што чалавек з'яўляецца знакамітай асобай (мастаком, кампазітарам, пісьменнікам).

2. З прапанаваных характарыстык выберыце тыя, па якіх можна меркаваць пра тое, што чалавек з'яўляецца знакамітай асобай:

а) пра гэту асобу ведае большасць жыхароў нашай мясцовасці;

б) гэта асоба выдатна танцуе;

в) музычныя творы гэтай асобы мы часта чуем з канцэртных пляцовак нашага горада;

г) гэта асоба вядзе цікавы краязнаўчы блог;

д) на доме, дзе пражывала гэта асоба, устаноўлена памятная дошка;

е) гэта асоба вядзе серыю забаўляльных праграм на нацыянальным тэлебачанні.

3. Дапоўніце пералік характарыстык знакамітай асобы.

*Падагульненне*

— Што нам дае знаёмства з творчай дзейнасцю знакамітай асобы?

— Вызначце, якой знакамітай асобе будзе прысвечаны наш праект. Растлумачце свой выбар.

**II. Збор інфармацыі пра факты з жыцця знакамітай асобы.**

Існуе шмат разнастайных крыніц, дзе можна знайсці звесткі пра знакамітых асоб. Вось некаторыя з іх:

1. Асветнікі зямлі беларускай / склад. : Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. — Мінск : Красіка-Прынт, 2014. — 40 с.
2. Асветнікі зямлі беларускай: культурна-адукацыйны праект / Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. М. Танка. — Мінск : Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. М. Танка, 2022. — 30 с.
3. Асветнікі зямлі Беларускай, X — пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік / рэдкал : Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. — 490 с.
4. Багадзяж, М. Сыны зямлі беларускай / М. Багадзяж. — Мінск : Народная асвета, 2002. — 94 с.
5. Беларускія пісьменнікі : бібліяграфічны слоўнік : у 6 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1992–1995.
6. Вытокі песні : аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1973. — 336 с.
7. Літаратурная карта Берасцейшчыны / укл. А. М. Крэйдзіч. — Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008. — 504 с.
8. Рогалеў, А. Ф. Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі) / А. Ф. Рогалеў. — Гомель : Барк, 2008. — 216 с.
9. Францыск Скарына і яго час : энцыклапедычны даведнік. — Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1988. — 608 с.
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2004.
11. Янка Купала : энцыклапедычны даведнік. — Мірск : Беларуская Савецкая энцыклапедыя, 1986. — 727 с.
12. Якуб Колас: да 100-годдзя з дня нараджэння. Бібліягр. паказ. / уклад. Н. Б. Ватацы, М. І. Пратасевіч, Н. А. Адамовіч, А. Б. Дунаеўская ; рэд. В. П. Рагойша. — Мінск : Дзяржбібліятэка БССР, 1983. — 422 с.

— Якія з прапанаваных крыніц могуць вам дапамагчы знайсці інфармацыю пра знакамітую асобу, якой будзе прысвечаны ваш праект?

### Заданне 2

Складзіце спіс крыніц, неабходных для стварэння вашага праекта пра знакамітую асобу.

### Заданне 3

Адной з крыніц інфармацыі пра знакамітую асобу можа стаць інтэрв'ю з яго сваякамі. Складзіце пералік пытанняў, што вы задалі б родным людзям знакамітай асобы, якой будзе прысвечаны ваш праект.

### Заданне 4

Сістэматызаваць сабраную інфармацыю вельмі часта дапамагае складанне храналагічнай табліцы лёсавызначальных этапаў жыцця і творчасці знакамітай асобы. Разгледзьце табліцу 15. Якія змены варта ўнесці ў гэту табліцу, каб апісаць жыццё той знакамітай асобы, пра якую вы збіраеце інфармацыю? Запоўніце табліцу 15.

*Табліца 15*

**Жыццё знакамітай асобы**

| Гады жыцця | Біяграфічныя звесткі | Мастацкія творы |
|---|---|---|
| | | |

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: партрэтны нарыс знакамітай асобы мясцовасці.**

**Заданне 5**

1. Прачытайце тэкст. У якой сферы мастацтва праславіўся Ігнат Буйніцкі?

**Буйніцкі Ігнат Цярэнцьевіч (22.08.1861–22.09.1917)**

Беларускі тэатральны дзеяч, акцёр, рэжысёр; стваральнік нацыянальнага прафесійнага тэатра. Нарадзіўся ў в. Палевачы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1907–1913 гадах кіраўнік Першай беларускай трупы, адзін з ініцыятараў арганізацыі Першага таварыства беларускай драмы і камедыі. Збіраў для тэатра беларускія танцы, узоры народнага адзення, арнаменту, размалёўкі, залучаў да ўдзелу ў пастаноўках таленавітых выканаўцаў-сялян, нястомна прапагандаваў беларускі тэатр, арганізоўваў аматарскія гурткі. Як кіраўнік тэатра, падтрымліваў яго ўласнымі сродкамі. Пастаноўшчык большасці спектакляў Першай беларускай трупы. Вызначаўся тэмпераментным выкананнем беларускіх народных танцаў, якія сам і ставіў. Выступаў у ролях бытавога і характарнага плана: Аляксей («У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі), Ігнась («Модны шляхцюк» К. Каганца), Антон, Міранові́ч («Пашыліся ў дурні», «Па рэвізіі» М. Крапіўніцкага). Залажыў асновы сучаснага беларускага тэатральнага мастацтва. На радзіме яму ўстаноўлены помнік (1976, скульптар І. Міська) *(Паводле «Асветнікі зямлі беларускай»)*.

2. З якой мэтай напісаны гэты артыкул? Што на гэта ўказвае?
3. Якія факты жыцця Ігната Буйніцкага ўказваюць на тое, што ён — знакамітая асоба? Якія ролі выконваў Буйніцкі? Збіраннем якіх мастацкіх твораў ён займаўся? У якім населеным пункце ўстаноўлены помнік Ігнату Буйніцкаму?
4. Прааналізуйце будову артыкула. Складзіце яго план.

**Заданне 6**

1. Прачытайце тэкст. Дзе, на вашу думку, ён быў апублікаваны?

**Ігнат Буйніцкі стварыў беларускі тэатр і памёр у танцы**

Жыццёвы шлях Ігната пачаўся 22 жніўня 1861 года ў бацькоўскім фальварку Празарокі Дзісенскага павета Віленскай губерні. Змалку прывучыўся да сялянскай працы, пасля вучыўся ў Рызе, дзе скончыў землямерную вучэльню. Ад бацькі Тарквінія Буйніцкага ён атрымаў забалочаны кавалак зямлі. Па натуры працавіты, дзейсны, нават упарты Ігнат з запалам узяўся за прывядзенне да ладу гіблай зямлі і давёў яе да ладу.

Праявілася яго характэрная рыса — не чакаць чужой ласкі, а разлічваць на сябе, на свае сілы і ўпарта ісці да намечанай мэты. Калі захацеў набыць яшчэ зямлі, пайшоў працаваць па сваёй прафесіі — землямерам. Працаваў на Полаччыне, Ашмяншчыне, Наваградчыне, Магілёўшчыне. Задуманае здзейсніў! Ён наладжваў народныя гулянкі на дажынкі і Купалле ці проста падчас кірмашоў. Запрошаныя ім музыкі гралі на цымбалах, скрыпках, дудзе. Гучалі народныя песні, а пасля пачыналіся заліхвацкія танцы, калі ногі самі пускаліся ў скокі. І першым танцорам быў як раз сам Буйніцкі. «Ох, і скакаў жа! Быццам віхор які праносіўся. Другога такога танцора ніколі ў жыцці не бачыў», — узгадвае адзін з жыхароў Празарокаў.

Неўзабаве слава пра танцораў Буйніцкага дасягнула і Вільні. Іх запрасілі на беларускую вечарынку, якую ладзіла рэдакцыя «Нашай нівы». Вялізная зала чыгуначнага гуртка была забіта народам. Прыйшлі не толькі беларусы, але чулася літоўская, руская, польская мовы. Публіка чакала чагосьці незвычайнага. «Першы раз павінна была паказацца перад шырокім светам беларуская душа, явіцца ў сваіх песнях, танцах, музыцы», — піша «Наша Ніва». На пачатку была паказана камедыя

Крапіўніцкага «Па рэвізіі» ў пастаноўцы Алеся Бурбіса, пасля выступіў хор пад кіраўніцтвам кампазітара і дырыжора Людаміра Рагоўскага. Беларускія народныя песні кранулі сэрцы і душы людзей, некаторыя песні спяваліся на «біс» па некалькі разоў. Але сапраўднай феерыяй стала выступленне танцавальнай групы Буйніцкага. Пад жвавую музыку скрыпак і цымбал пачаліся танцы: «Лявоніха», «Мяцеліца», «Юрка» і «Верабей». «Трэба прызнацца, што яны ўдаліся на хвалу! — пісала «Наша ніва». — Публіка проста адурэла. Усе без канца крычалі: «Брава! Біс!». Па тры-чатыры разы прыйшлося гуляць кожны танец». Паводле ўспамінаў Паўліны Мядзёлкі, яна была ўражаная выступленнем танцораў Ігната Буйніцкага. «За ўсё сваё жыццё я нідзе і ніколі не бачыў такога бурнага масавага ўзрушэння ў тэатральнай зале, такой гамы пачуццяў, якія міжвольна вырваліся з людскіх грудзей».

Падчас аднаго з такіх канцэртаў ад перанапружання ў Буйніцкага лінула з горла кроў і спынілася сэрца. Нешта глыбока сімвалічна было ў яго смерці: ён нарадзіўся, каб узвысіць народны танец да класічнага мастацтва, і, апантаны сваёй місіяй, памёр у танцы, як герой на полі боя *(Паводле Вітаўта Чаропкі «Ігнат Буйніцкі стварыў беларускі тэатр і памёр у танцы»)*.

2. З якой мэтай напісаны гэты артыкул? Што на гэта ўказвае?

3. Параўнайце два артыкулы пра Ігната Буйніцкага. Чым адрозніваецца энцыклапедычны артыкул ад публіцыстычнага твора?

**Заданне 7.** «Ажывіце партрэт»

1. Знайдзіце партрэт (фотаздымак) знакамітай асобы, пра якую вы збіраеце инфармацыю, карыстаючыся інтэрнэт-крыніцамі. Якім чалавекам паўстае знакамітая асоба на партрэце? Што пра гэта сведчыць?

2. Складзіце слоўны партрэт знакамітай асобы, карыстаючыся табліцай 16.

*Табліца 16*

**Словы для даведкі**

| | |
|---|---|
| Вочы | жывыя, агнёвыя, бяздонныя, бліщчастыя, маладыя, іскрыстыя, чыстыя, зоркія, сонечныя, застылыя, калючыя, ледзяныя, пранізлівыя, шырока расплюшчаныя, агромністыя, буйныя, выразныя, задумлівыя, вялікія, глыбокія, хітрыя, вузкія, лупатыя, зялёныя, добрыя, недаверлівыя, ветлыя, праменныя, цёмныя, каварныя, вясёлыя, гарэзныя, задуманна-пяшчотныя, закаханыя, цікаўныя, шчаслівыя, ясныя, грозныя, жорсткія, змрочныя, сумныя |
| Позірк | палымяны, пранікліві, стомлены, адважны, дапытлівы, дасціпны, добры, разумны, дапытлівы, уважлівы, вясёлы, недаверлівы, адкрыты, разгублены, хітры, збянтэжаны, абыякавы, здзіўлены, сумны, любасны, цёплы, ласкавы, пяшчотны, удумлівы, рашучы, ажыўлены, гарачы, зіхатлівы, мужны, мяккі, светлы, пранікліві, спакойны, ясны, важкі, згаслы, зменлівы, пануры, стомлены, дабрадушны, далікатны, лагодны, прыветны, таемны, удумны, шчыры, няласкавы, разгублены, устрывожаны |
| Твар | загарэлы, румяны, светлы, смуглявы, бледны, збялелы, шэры, счарнелы, даўгі, буйны, круглы, поўны, стары, непрыемны, кірпаносы, чысты, шырокі, вузкі, скуласты, худы, шчакасты, абаяльны, мілавідны, прывабны, прыемны, сімпатычны, пяшчотны, родны, чысты, юнацкі, дзявочы, юны, змарнелы, знясілены, кволы, нездаровы, пабляклы, нецікавы, патухлы, стомлены, халодны, хваравіты, адухоўлены, анёльскі, валявы, бесклапотны, ганарысты, дружалюбны, інтэлігентны, натхнёны, пачцівы, сур'ёзны, упэўнены, шчаслівы, адчайны |
| Склад цела | моцны, поўны, спартыўны, прысадзісты, каржакаваты, хударлявы, тоўсты |

3. Падбярыце прыметнікі, якія зробяць слоўны партрэт больш выразным і вобразным.

### Заданне 8

1. Вася напісаў нататку ў школьную газету пра жыццё свайго знакамітага дзядулі. Прачытайце створаны ім тэкст.

**Вядомыя людзі ў маёй сям'і**

Не ведаю, колькі ў маёй сям'і было вядомых у Беларусі людзей, але я хачу распавесці пра аднаго чалавека — гэта мой дзядуля. Яго звалі Іван. Нарадзіўся ён у вёсцы Лішчыцы Лагойскага раёна ў 1949 г. У яго сям'і выхоўваліся яшчэ адна сястра і чатыры браты. Галоўным у сям'і была забота адзін пра аднаго. Скончыўшы школу ён з'ехаў у Мінскую вобласць, каб атрымаць адукацыю. У горадзе ён паступіў у медыцынскую вучэльню, якую скончыў, пазней яго запрасілі ў армію. Адслужыўшы, ён зразумеў, што яму неабходна працягваць навучанне. Іван паступіў у медыцынскі інстытут, дзе пасля размеркавання быў накіраваны ў маленькі горад Кобрын, што ля Віцебска. Менавіта там і пачалася яго кар'ера ўрача. У Віцебску ён стаў працаваць хірургам. Яго праца патрабавала шмат навыкаў і ўменняў, таму што такога абсталявання як зараз у яго не было. За сваю нястомную працу Іван атрымаў званне «Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь». Я вельмі ганаруся сваім дзедам.

2. Ці можна лічыць бездакорным маўленчае афармленне тэксту? Выкажыце свае прапановы па ўдасканаленні тэксту.

3. Перапрацуйце тэкст такім чынам, каб ён стаў своеасаблівай інструкцыяй «Як стаць знакамітым урачом».

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з'яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Напісанне партрэтнага нарыса ў «Краязнаўчую газету» пра знакамітую асобу рэгіёна з выкарыстаннем ілюстрацыйнага матэрыялу.

**V. Прэзентацыя праекта.** Сустрэча са знакамітай асобай (нашчадкамі знакамітай асобы).

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Што вы ўзялі для сябе са знаёмства са знакамітым чалавекам?
- Якія маральна-духоўныя якасці аказалі на вас асаблівае ўражанне? Абгрунтуйце свой адказ.
- Як можна ўшанаваць памяць пра знакамітую асобу, якой прысвечаны ваш праект?

# Модуль 8. Чалавек жыве век, а добрае дзела — два

Сама ўжо праца пакарае, захапляе чалавека, бо ў гэтай дружнай грамадскай працы так многа і музыкі, і паэзіі, і хараства.

*Якуб Колас.*

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні і заданні для роздуму над праектам:

- Выкажыце сваё меркаванне пра тое, што працавітасць — гэта адна з адметных рыс беларусаў. Ці згодны вы з гэтым выказваннем? Абгрунтуйце свой адказ.

**Заданне 1**

1. Прачытайце прыказкі. Як яны суадносяцца са сцвярджэннем, што працавітасць з'яўляецца адной з адметных рыс беларусаў? Ці згодны вы з гэтымі выказваннямі? Растлумачце, як вы разумееце іх сэнс.

- ✓ Праца нікога не ганьбіць.
- ✓ Па рабоце майстра відаць.
- ✓ Хто працуе, той і мае.
- ✓ Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму, хто ў справе стойкі.
- ✓ Цярплівасць і праца ўсё перамагаюць.
- ✓ Дрэва славіцца пладамі, а чалавек — працаю.
- ✓ Праца чалавека трымае і ўзбагачае.
- ✓ Работа і корміць, і поіць, і вучыць.
- ✓ Не той харош, хто прыгож, а той харош, хто да дзела гож.
- ✓ Сон на заўтра адкладзі, а работу сёння зрабі.
- ✓ Чалавек без працы, што птушка без крылаў.

— Дзе працуюць вашы бацькі? У некалькіх сказах раскажыце пра іх прафесію. Якія станоўчыя, а якія адмоўныя бакі прафесіі вылучаюць вашы бацькі? Выкажыце сваё меркаванне на гэты конт.

**Заданне 2**

1. Беларусь паставіла перад сабой задачу зрабіць якасць беларускіх тавараў нацыянальным брэндам. Якіх поспехаў, на ваш погляд, удалося дасягнуць у вырашэнні гэтай задачы? Пацвердзіце свой адказ фактамі.

2. Азнаёмцеся з пералікам прадпрыемстваў і назавіце іх асноўную прадукцыю:

- ✓ Беларуськалій
- ✓ Гарызонт
- ✓ Гроднаазот
- ✓ Лідасельмаш

- ✓ Нафтан
- ✓ Пінскдрэў
- ✓ Санта Брэмар
- ✓ Атлант
- ✓ Магатэкс
- ✓ Спартак
- ✓ БелАЗ
- ✓ Марк Фармэль
- ✓ Марка
- ✓ Мінскі хладакамбінат № 2
- ✓ Камунарка
- ✓ Конте
- ✓ Савушкін прадукт
- ✓ Спартак
- ✓ Чырвоны харчавік
- ✓ Шагавіта

3. Прадукцыі якіх прадпрыемстваў вы аддаяце перавагу? Абгрунтуйце свой адказ.

4. Якія з прадпрыемстваў знаходзяцца ў вашым рэгіёне?

5. Дапоўніце спіс прадпрыемствамі вашай мясцовасці (рэгіёна).

6. Складзіце топ-5 дасягненняў у галіне прамысловасці / сельскай гаспадаркі, якімі можа ганарыцца ваш рэгіён.

- Чаму вы выбралі менавіта гэтыя прадпрыемствы?
- Якое значэнне для чалавека мае праца?
- Якое значэнне для грамадства, краіны мае праца чалавека?

*Падагульненне*

— Якое значэнне для станаўлення асобы чалавека мае працоўная дзейнасць?

— Вызначце, складанню рэкламнага буклета якога прадпрыемства вашай мясцовасці будзе прысвечаны праект. Растлумачце свой выбар.

**II. Збор інфармацыі пра аб’екты прамысловасці мясцовасці.**

Для збору інфармацыі рэкамендуецца выкарыстаць інтэрнэт-рэсурсы, матэрыялы рэгіянальных газет, статыстычныя даведнікі, матэрыялы краязнаўчага музея, архіўныя матэрыялы, гадавыя справаздачы прадпрыемства, разнастайную рэкламную прадукцыю.

### Заданне 3

Збор інфармацыі можна арганізаваць па наступных напрамках:

- гісторыя будаўніцтва і адкрыцця прамысловага прадпрыемства (гісторыя стварэння сельскагаспадарчага прадпрыемства) вашага рэгіёна;
- кіраўнікі прадпрыемства;
- штат прадпрыемства;
- працоўныя дынастыі;
- перадавікі вытворчасці;
- прадукцыя прадпрыемства;
- паказчыкі вытворчасці;
- асаблівасці вытворчага і тэхналагічнага працэсаў;
- рэалізацыя прадукцыі;

- спажыўцы;
- сацыяльная работа прадпрыемства;
- прафсаюзны камітэт.

Прапануем наступныя крыніцы для работы:

1. Беларусь — страна вкусной еды: каталог предприятий. — [Б. м. : б. и., 2023?]. — [26] с. — (Сделано в Беларуси).

2. Бренды Беларуси : 100 успешных брендов / А. Богино [и др.]. — Минск : РенессансПаблишинг, 2022. — 567 с.

3. Институты корпоративного управления в системе государственного сектора национальной экономики / Т. В. Садовская [и др.]. — Минск : Беларуская навука, 2022. — 247 с.

4. Реестр, 2022/2023: каталог предприятий Беларуси : телефонный бизнес-справочник: по состоянию на 16.12.22 / сост. : А. А. Абрамович [и др.]. — Минск : Айбиз Медиа, печ. 2022. — 711 с.

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: рэкламны буклет «Прамысловае (сельскагаспадарчае) прадпрыемства мясцовасці»**.

**Заданне 4**

1. Прачытайце тэкст. Пра якія творчыя калектывы ў ім ідзе размова?

**Праца II Беларускай трупы ў 1921 годзе**

II Беларуская трупа, якая працуе ўжо амаль што два гады, у 1921 г. зрабіла ў культурным напрамку вялікую працу.

За 1921 г. дадзена 150 спектакляў па ўсіх клубах Мінска і ў павеце: у рабочым Беларускім клубе — 76 спектакляў; у Пралетарскім клубе — 8; у клубе «Беларуская хатка» — 4; пры заразных бальных — 7 і г. д.

Глянуўшы на гэты пералік спектакляў, можна бачыць, якую вялікую працу зрабіла гэта маленькая трупа, у якой адсутнічае і належная вопратка, і рэквізіт. Трэба мець дужа вялікую вытрываласць, каб так безупынна працаваць. Артысты трупы — непамерна цярплівыя і мужныя людзі, калі здолелі працаваць у такіх цяжкіх абставінах. Трэба ведаць, што кожны артыст жыве не заработкамі сцэны, а служыць у другіх установах і толькі вольны час аддае культурнай працы.

Вельмі цяжка артыстам трупы прыходзілася восенню і зімой. Артысты пешшу ішлі ў тэатр і неслі ў руках сваю вопратку і рэквізіт, губляючы пры гэтым сілы і энергію. Зімою яшчэ горш: маразы па 20–25 градусаў перашкаджалі працаваць. Паколькі клубы не ацяпляліся, артысты мёрзлі, хварэлі, але ўсё роўна працавалі. А вясной артысты трупы вялі культурную працу між сялян, надзвычай важную для беларускага грамадства.

Рэпертуар трупы досыць вялікі і, праўду кажучы, заўсёды арыгінальны. Перакладамі трупа амаль што не карысталася, а ставіла толькі ўласныя беларускія творы. У 1921 г. такіх арыгінальных твораў было дванаццаць.

Разам з трупай працаваў хор Равенскага, а ўвосень ён вылучыўся ў самадзейную адзінку і, атрымаўшы ад праўлення клуба згоду, пачаў даваць у ім канцэрты *(Паводле Уладзіслава Галубка «Праца II Беларускай трупы ў 1921 г.»)*.

2. Якімі маральнымі якасцямі валодалі тэатральныя акцёры трупы Уладзіслава Галубка? Ці ўласцівыя гэтыя маральныя якасці сённяшнім акцёрам? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

3. Пералічыце цяжкасці, якія сустракалі акцёры ў трупе Уладзіслава Галубка. Ці ўсе акцёры трупы мелі прафесійную адукацыю?

4. Знайдзіце сказ, які сведчыць пра тое, што для некаторых акцёраў праца ў тэатральнай трупе была не асноўнай.

5. У якіх умовах адбывалася тэатральнае прадстаўленне II Беларускай трупы ў дзень пастаноўкі?

6. У чым карысць грамадству ад наведвання тэатральных пастановак? Што меў на ўвазе Уладзіслаў Галубок? Выкажыце сваё меркаванне.

7. Карыстаючыся даведнікамі, знайдзіце інфармацыю пра тэатральныя пастаноўкі II Беларускай трупы, яе супрацоўніцтва з іншымі культурна-асветніцкімі калектывамі. Зрабіце кароткае паведамленне ў класе.

### Заданне 5

1. Пазнаёмцеся з інфармацыяй аб працоўных дынастыях ў нашай краіне. Якія працоўныя прафесіі пералічваюцца ў тэксце?

#### Стаж даўжынёй у стагоддзі

Для кожнай прафесійнай дынастыі гэтыя словы — не проста радкі з біяграфіі, а неад'емная частка жыцця некалькіх пакаленняў. Напрыклад, дынастыя Рынейскіх з Бабруйска працуе на родным прадпрыемстве — машынабудаўнічым заводзе — увогуле 512 гадоў! З 1930 года 16 прадстаўнікоў гэтай сям'і, пераймаючы адзін у аднаго працоўную эстафету, укладваюць свае веды і ўменні ў развіццё прадпрыемства. А дынастыя медыкаў Шаўцовых-Хоравых з Гродзеншчыны налічвае ўжо 5 пакаленняў урачоў: ад народнай лякаркі да цяперашніх спецыялістаў — дактароў медыцынскіх навук, прафесараў і дацэнтаў. У сукупнасці амаль 300 гадоў працоўнага стажу маюць прадстаўнікі дынастыі чыгуначнікаў Шырчанкі.

Як перадаць любоў да працы спадчыннікам, калі сёння невялікая частка маладых людзей жадае працягнуць справу бацькоў? Прадстаўніца дынастыі настаўнікаў, выкладчыца рускай мовы і літаратуры (Добрушскі раён) Людміла Атрошчанка распавяла на гэты конт сваю гісторыю:

— Мая мама, Марыя Храпуцкая, выканала запавет свайго бацькі: сыходзячы на фронт той прасіў стаць настаўніцай. І хоць трэба было шмат вучыцца і працаваць, і часта даводзілася нават начаваць у стозе сена, калі мачыха замыкала дзверы, яна атрымала запаветны дыплом настаўніцы беларускай мовы... А потым ужо мы са старэйшай сястрой, яшчэ не ходзячы ў школу, сядзелі на апошняй парце, пакуль мама вяла ўрокі, а нас не было куды падзець. Мы засыналі пад скрып чарнільнай ручкі, дапамагалі правяраць сшыткі, чыталі кнігі з вялізнай дамашняй бібліятэкі і ўвесь час чулі размовы аб настаўніцкай працы. Прычым размовы гэтыя былі пазітыўныя: настаўніка паважалі, часта ішлі параіцца да яго. А яшчэ ў нашай сям'і на першым месцы ніколі не стаяла матэрыяльнае, галоўным лічылася духоўнае. Мабыць, усе гэтыя фактары ў сукупнасці і абумовілі свядомы выбар прафесіі педагога.

Уладзімір Пашкевіч працуе ў аб'яднанні «Беларуськалій» 40 гадоў. Некалі тут працаваў шахцёрам бацька, цяпер на адным прадпрыемстве шчыруюць сам Уладзімір Аляксандравіч, яго брат, дачка, зяць, пляменнік...

— У 1980-я гады, калі наша вытворчасць перажывала не лепшыя часы, мне нават прапаноўвалі паехаць галоўным інжынерам у Сібір, — прыгадвае Уладзімір Пашкевіч, — але я адмовіўся. Бо параіўся з бацькам і зразумеў, што не магу так узяць і кінуць справу, якую пачынаў яшчэ ён. І ведаеце, мы ганарымся, што разам перажылі ўсе цяжкасці, якія выпалі на долю прадпрыемства.

Трэба даць зразумець сучасным маладым людзям, што ў іх ёсць магчымасць дасягаць поспеху, у тым ліку і матэрыяльнага дабрабыту, калі яны, па-першае, займаюцца сапраўды любімай справай, а па-другое, не чакаюць манны нябеснай,

а развіваюцца і ўдасканальваюцца ў прафесіі. Дапамагчы ў гэтым змогуць расповеды пра дынастыі, якія нястомна працуюць і атрымліваюць плён. І яшчэ, безумоўна, у фарміраванні дынастыі важны дух маюць сям'я, высокамаральнае выхаванне і прыклад папярэдняга пакалення, гледзячы на якое нехта возьме інструменты ў рукі, а хтосьці апране белы халат...

Аграрыі, педагогі, транспартнікі, сувязісты, прадстаўнікі нафтахімічнай галіны, прамысловасці, медыцыны... Магчыма, менавіта прыклады вернасці справе сваіх бацькоў і дзядоў дынастый у розных галінах дапамогуць сённяшнім школьнікам па-сапраўднаму зразумець каштоўнасць працы і не памыліцца ў выбары будучай прафесіі *(Паводле Вікторыі Целяшук «Прафесіянал у пятым калене»)*.

2. Якія якасці асобы ўласцівы людзям працоўных дынастый? Ці ўласцівыя гэтыя якасці вам асабіста? Як яны адлюстроўваюцца ў вашым жыцці? Ці магчыма іх развіць або выпрацаваць?

3. Што самае галоўнае ў фарміраванні дынастыі? Ці хацелі б вы авалодаць прафесіяй бацькоў?

4. Падрыхтуйце кароткае паведамленне аб працоўных дынастыях у вашай мясцовасці. Запоўніце табліцу 17.

*Табліца 17*

**Працоўныя дынастыі**

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Сфера дзейнасці | |
| Колькасць пакаленняў дынастыі | |
| Агульны стаж | |
| Набыткі і дасягненні | |

## Заданне 6

1. Прачытайце тэкст. Здагадайцеся, пра якое свята ідзе гаворка ў тэксце.

... у свядомасці і побыце сялян былі вельмі значнай вяхой сельскагаспадарчага календара і ўрачыстым святам у жыцці вёскі. Суправаджаліся ... ланцужком паслядоўных абрадаў і рытуалаў, што пачыналіся ўжо на апошняй няжжатай лапінцы жытняй нівы. Гэта была самая ўрадлівая густая мясціна, якую называлі «барада». Жняя зразала яе адным узмахам сярпа. «Бараду» разам з апошнім снапом неслі ў вёску і ўрачыста ўручалі гаспадару ці гаспадыні. У «барадзе» пакідалі тры калівы жыта, якія намотвалі на акраец хлеба і потым разам з жытам закопвалі ў зямлю. Лічылі, што гэты рытуал закладваў ураджай наступнага года. Рытуал качання жанчын па жыце быў накіраваны на магічны зварот сілы, затрачанай жняёй у час працы. Спяванне песень-заклінанняў узмацняла магію. На завяршэнне ... дзяўчаты звівалі рытуальны вянок з васількоў, рамонкаў і каласоў-спарышоў. Такі вянок сімвалізаваў заканчэнне жніва, вяртанне ў хату магіі ўрадлівасці, магіі хлеба як сімвала дастатку ў гаспадарцы. Урачысты і ўзнёслы тон ... песень адпавядаў настрою хлебаробаў, якія па-сапраўднаму маглі адчуваць і разумець урачыстасць і значнасць свята заканчэння жніва. У цэлым высокапаэтычная паэзія жніва прасякнута гуманістычнымі і высокамаральнымі поглядамі народа на жыццё, чалавека працы, яго прызначэнне на зямлі *(Паводле Антона Гурскага)* (мал. 52).




*Мал. 52.* Дажынкі ў Добрушы ў 2022 годзе

2. Устаўце ў тэкст правільныя формы слова «дажынкі», а таксама яго вытворных.

3. Якія вы ведаеце прафесіі, звязаныя з працай у сельскай гаспадарцы?

4. Ці ўдзельнічалі вы ў святе «Дажынкі»? Калі ўдзельнічалі, то якую выконвалі ролю?

5. Знайдзіце інфармацыю пра правядзенне «Дажынак» у вашым рэгіёне і падрыхтуйце кароткую даведку пра гэту падзею:

- год правядзення;
- мясцовасць;
- святочныя пляцоўкі;
- удзельнікі;
- пераможцы.

6. Зрабіце кароткае паведамленне пра «Дажынкі» ў вашай мясцовасці. Абмяркуйце паведамленне на занятках.

**Заданне 7**

1. Прачытайце тэкст. Да якога літаратурнага жанру можна яго аднесці?

**Самазвалы БЕЛАЗ будуць працаваць у пустыні Гобі**

«БелАЗ адгрузіў тры партыі кар'ерных самазвалаў кансорцыуму па распрацоўцы вугальнага радовішча "Эрдэнэс Таван Талгой"», — паведамілі БелТА ў прэс-службе прадпрыемства.

«130-тонныя БЕЛАЗы, укамплектаваныя з улікам экстрэмальных кліматычных умоў пустыні Гобі, будуць працаваць на вугальным радовішчы ў Манголіі. «Эрдэнэс Таван Талгой» на поўдні пустыні Гобі з'яўляецца адным з найбуйнейшых па запасах ў свеце (6,5 млрд тон вугалю, каля 40 % якіх — высокакаларыйны кокс вугаль)», — адзначылі на прадпрыемстве.

Па словах прэс-службы, мангольскія спажыўцы добра знаёмыя з брэндам БЕЛАЗ, маюць вялікі вопыт эксплуатацыі і абслугоўвання беларускіх кар'ерных самазвалаў. Тэхніка БЕЛАЗ пастаўляецца ў Манголію з 1970-х гадоў. У апошнія пяць гадоў пастаўкі ажыццяўляюцца штогод, прычым вялікімі партыямі. Толькі ў мінулым годзе ў гэту краіну накіравана 35 кар'ерных самазвалаў.

У здабываючых кар'ерах Манголіі зараз выкарыстоўваецца больш за 200 адзінак тэхнікі БЕЛАЗ. Найбольш папулярныя ў мангольскіх спажыўцоў кар'ерныя самазвалы серыі БЕЛАЗ-7513. Сёння вядуцца перамовы аб пастаўцы яшчэ адной буйной партыі тэхнікі: самазвалаў, пагрузчыкаў, бульдозераў і паліваарашальных машын для абслугоўвання кар'ера *(Паводле zviazda.by «Самазвалы БЕЛАЗ будуць працаваць у пустыні Гобі»)*.

2. Знайдзіце ў інтэрнэце наступныя характарыстыкі самазвала БЕЛАЗ-7513: даўжыня, шырыня, вышыня, маса, грузапад'ёмнасць, магутнасць (у конскіх сілах). З чым звязаны такія гіганцкія памеры самазвала? Знайдзіце фотаздымак гэтай мадыфікацыі.

3. Карыстаючыся даведачнай інфармацый, адкажыце на пытанні:

- Колькі гадоў налічвае гісторыя БЕЛАЗа?
- Абазначце лінейку прадукцыі, што выпускаецца заводам БЕЛАЗ.
- Якія прадпрыемствы ўваходзяць у «БЕЛАЗ-холдынг». Як вы разумееце паняцце «холдынг»? Праверце, ці супадае ваша меркаванне з агульнапрынятым, карыстаючыся слоўнікам. Якую прадукцыю прадпрыемствы «БЕЛАЗ-холдынг» пастаўляюць на БЕЛАЗ?
- Які аб'ём вытворчасці буйной тэхнікі ў год?
- Якімі ўзнагародамі ўганаравана прадпрыемства?

4. Складзіце карту транспартных шляхоў па збыту прадукцыі прадпрыемства (мал. 53).




*Мал. 53.* Карта сбыту прадукцыі

5. Карыстаючыся данымі афіцыйнага сайта БЕЛАЗа (https://belaz.by/), пабудуйце дыяграмы або графікі:

- валавай выручкі за 2015, 2016, 2017, 2018 гады;
- савакупнага прыбытку за 2015, 2016, 2017, 2018 гады;
- змены курсаў расійскага рубля, долара і еўра, згодна са справаздачамі БЕЛАЗа.

6. Якую частку выручкі склаў продаж кар'ерных самазвалаў і спецыяльнай тэхнікі ў 2016, 2017, 2018 гадах (па выбару)? Якую частку выручкі склаў продаж іншай прадукцыі прадпрыемства?

7. Як мяняўся фонд заробку працаўнікоў БЕЛАЗа ў 2017, 2018 гадах?

8. Прааналізуйце даныя і ацаніце эфектыўнасць работы завода БЕЛАЗ.

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з’яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Складанне рэкламнага буклета «Прамысловае (сельскагаспадарчае) прадпрыемства рэгіёна».

**V. Прэзентацыя праекта**. Паведамленне аб прамысловым прадпрыемстве мясцовасці падчас класнай гадзіны або інфармацыйных мерапрыемстваў установы адукацыі.

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?

Пры адказе можна выкарыстоўваць фразы:
За час праекта я даведаўся…
Было цікава…
Мяне здзівіла…
Я зразумеў, што…
Было цяжка…
У мяне атрымалася…
Я паспрабую…
Мне захацелася…
Праект даў мне…

# Модуль 9. На добрай зямлі добрая надзея

А дні, што маланкі ў нас, за тыднямі — месяц, год...
Вазьмі мяне, новы час. Вазьмі мяне ў свой паход!

*Пятрусь Броўка.*

**І. Абмеркаванне тэмы праекта і напрамкаў дзейнасці.**

Пытанні для роздуму над праектам:

- Якім будзе сусвет праз 30, 50, 100 гадоў? Якой будзе Беларусь? Якой будзе мясцовасць, у якой вы нарадзіліся?
- Што вы хацелі б змяніць у сваім жыцці, а што не? Што хацелі б захаваць і прымножыць?
- Як будуць жыць нашы дзеці і ўнукі? Ці будуць у іх тыя даброты, якія ёсць у вас? Ці будуць яны шчаслівыя? Ці будуць яны жыць у бяспецы?
- Ці будзе павялічвацца экалагічны крызіс? Што будзе, калі скончацца рэсурсы нашай планеты?
- Што залежыць ад чалавецтва? Што залежыць уласна ад вас?

**Заданне 1**

1. Прачытайце выказванні вучоных пра тое, якога ўзроўню могуць дасягнуць тэхналогіі к 2050 году. У якіх сферах жыццядзейнасці чалавека прагназуюцца сур’ёзныя змены?

Футуролагі лічаць, што ў будучыні на рынку вытворчасці тавараў будуць кіраваць 3D-прынтары. Кожны зможа ствараць рэчы, згодна са сваім густам і патрэбамі. Уявіце: вам трэба купіць падарункі на Новы год. Замест таго, каб марнаваць час на шопінг, вы загрузіце ў інтэрнэт чарцёж неабходнай дзіцячай лялькі, якую вам раздрукуюць і прывязуць ў вызначаны час. А каб атрымаць красоўкі сваёй мары, дастаткова зняць меркі ступні і прынтар зробіць зручную пару абутку, а робат-кур’ер яе даставіць. Такі падыход не толькі дазволіць ствараць індывідуальныя тавары, але і з-за скарачэння лагістычнага ланцужка, безумоўна, будзе спрыяць экалогіі.

К 2050 г. медыкі навучацца штучна вырошчваць органы чалавека. Футуролагі кажуць і аб развіцці дыягностыкі. Напрыклад, інжынеры створаць бранзалет для рэгулярнага маніторынгу паказчыкаў вашага арганізма, які будзе даваць трапныя парады, а ў выпадку бяды выкліча да вас урача. Верагодна, што нам будуць даступныя ў любы час анлайн-кансультацыі з лекарамі-спецыялістамі, а чэргі ў паліклініках сыдуць у мінулае.

Хутчэй за ўсё робаты і камп’ютары захопяць усю сферу паслуг: будуць прыбіраць вуліцы і падаваць ежу ў рэстаранах. Пойдзе ў занябыт прафесія кур’ера, бо тавары будуць дастаўляць робаты-беспілотнікі. Толькі ўявіце: вы зрабілі заказ у інтэрнэт-краме, які праз 10 хвілін вам даставіў робат-беспілотнік. Вельмі зручна! А дронаў будуць выкарыстоўваць для назірання за парадкам на вуліцах і рэгулявання руху.

Ужо існуюць тканіны, здольныя мяняць колер у залежнасці ад навакольнага асяроддзя. Здаецца, у будучыні мы будзем насіць вельмі лёгкую, але пры гэтым

цёплую вопратку. Навукоўцы заклапочаны стварэннем новых матэрыялаў на аснове пластыку, металу або бетону. Верагодна, к 2050 г. будуць будаваць хмарачосы з лёгкіх, але, як сталь, трывалых блокаў.

З развіццём інтэрнэт-тэхналогій зменяцца звычайныя фарматы адукацыі і працы. Эфектыўна вучыцца і працаваць можна будзе дыстанцыйна. У мінулае сыдуць лекцыі і семінары, а выкладчыкі будуць патрэбныя толькі для настаўніцтва і дапамогі ў планаванні будучыні *(Паводле Ганны Андрыянавай «Якім будзе свет у 2050 годзе па меркаваннях футуролагаў»)*.

2. Абмяркуйце прагнозы будучыні 2050 года ў групах. З якімі прагнозамі вы нязгодны? Абгрунтуйце свой адказ. Выкажыце меркаванне пра тое, у якіх яшчэ сферах жыццядзейнасці чалавека магчымыя кардынальныя змены.

3. Разгледзьце малюнкі 54–57. Суаднясіце іх з адпаведным апісаннем.









*Мал. 54–57.* Гарады будучыні

**«Горад будучыні» ў Бразіліі** бельгійскага архітэктара-футурыста Вінсэнта Калебо можа з’явіцца недалёка ад Рыа-дэ-Жынэйра. Гэта першы ў свеце праект горада, раздрукаванага на 3D-прынтары. Матэрыялам для будаўніцтва стануць перапрацаваныя пластыкавыя адыходы і водарасці. Тут змогуць пражываць каля 20 тысяч чалавек.

**Акіянская спіраль у Японіі**. У Японіі да 2035 года плануюць пабудаваць першы ў свеце падводны горад Акіянская спіраль. Праект уяўляе сабой гіганцкія — дыяметрам да 1,5 км — гумовыя сферы, якія могуць усплываць на паверхню або апускацца на дно па спіральнай канструкцыі, якая сыходзіць на глыбіню да 15 км. Такая сістэма павінна засцерагчы людзей падчас цунамі і землятрусаў. Кожны шар разлічаны на 5 тысяч чалавек. У аснове спіралі будзе пабудаваны завод па здабычы карысных выкапняў. Кіслярод плануецца здабываць з вуглякіслага газу, а электраэнергію атрымліваць за кошт розніцы ціску і тэмператур.

**«Чэнду — Вялікі горад»** стане сельскагаспадарчым цэнтрам, разлічаным на 80 тысяч жыхароў. У ім не будуць выкарыстоўваць транспартныя сродкі.

**Праект «Умка».** Распрацаваны ў Расіі на аснове касмічнай станцыі, горад плануецца пабудаваць у Паўночным Ледавітым акіяне. Аснову горада будучыні складаюць жылыя дамы, школы, гасцініцы, бальніца, аква- і лунапаркі, заводы па вытворчасці хлеба, рыбных прадуктаў і па перапрацоўцы адыходаў.

— Ці ўдасца ажыццявіць амбіцыйныя праекты, пра якія ідзе гаворка ў заданні? Абгрунтуйце свой адказ.

4. Прачытайце наступныя выказванні пісьменнікаў-фантастаў адносна будучыні чалавецтва:

- ✓ ліфты будуць злучаць паміж сабой дамы;
- ✓ электронныя чыпы заменяць усе дакументы чалавека;
- ✓ дзеці будуць хадзіць у школу тры разы на тыдзень;
- ✓ метро будзе пракладзена ў паветры;
- ✓ у гарадах з'явяцца хмарачосы ў 200 паверхаў;
- ✓ на дамах знікнуць шыльды з назвамі вуліц;
- ✓ людзі адмовяцца ад прыватнага транспарту.

З якімі выказваннямі пісьменнікаў-фантастаў вы згодны, а з якімі не? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

*Падагульненне*

— Што мы можам зрабіць для таго, каб нашы нашчадкі былі шчаслівымі і жылі ў квітнеючай Беларусі?

Наш праект будзе прысвечаны арганізацыі выставы «2050. Рэгіён вачамі дзяцей».

**II. Збор інфармацыі пра будучыню мясцовасці**.

**Заданне 2**

1. Якім вы бачыце рэгіён у 2050 годзе? Якія сферы дзейнасці чалавека ў 2050 годзе вы будзеце разглядаць у праекце? Складзіце асацыяграму (мал. 58).




*Мал. 58.* Напрамкі дзейнасці чалавека ў 2050 г.

2. Знайдзіце інфармацыю па акрэсленых напрамках у інтэрнэт-рэсурсах і навукова-папулярнай літаратуры.

**Заданне 3**

1. Карыстаючыся разнастайнымі крыніцамі, складзіце спіс твораў (фільмаў) беларускіх і замежных пісьменнікаў-фантастаў (рэжысёраў), якія ў сваёй творчасці звярталіся да тэмы будучыні.

2. Як прадстаўлены ў іх планіроўка гарадоў, сістэма кіравання, сацыяльнае жыццё, культура, навукова-тэхнічны прагрэс, экалогія? Што з гэтага падаецца найбольш рэалістычным, а што — фантастычным? Абгрунтуйце свой адказ.

Крыніцы інфармацыі для выкарыстання:

1. Агеев, А. И. Будущее отбрасывает тени / А. И. Агеев, Т. А. Иванова. — Москва : Институт экономических стратегий, РУБИН, 2017. — 254, [1] с.

2. Курляндский, В. Послания древних жрецов / В. Курляндский. — М. : РИПОЛ классик, 2003. — 379 с. — (Тайны. Находки. Сенсации).

3. Рождение и гибель цивилизаций: Ключи к разгадкам тайн мировой истории : сборник. — М. : РИПОЛ классик, 2004. — 510 с.

4. Курцвейл, Р. Эволюция разума, или бесконечные возможности человеческого мозга, основанные на распознавании образов / Р. Курцвейл. — Москва : Эксмо, 2018. — 349 с. — (Большая наука).

5. Курцвейл, Р. Эволюция разума: как расширение границ нашего разума позволит решить многие мировые проблемы / Р. Курцвейл. — Москва : Эксмо, 2016. — 448 с. — (Civilizация).

**III. Абмеркаванне формы рэалізацыі праекта: выстава «2050. Рэгіён вачамі дзяцей».**

**Заданне 4**

1. Прачытайце дыяграму (мал. 59), на якой адлюстравана змяненне колькасці насельніцтва ў свеце. Які перыяд адлюстраваны на дыяграме?




*Мал. 59.* Змяненне колькасці насельніцтва на Зямлі (млн чал.)

2. Якая колькасць насельніцтва будзе ў 2025 годзе? Якая колькасць насельніцтва будзе яшчэ праз 10 гадоў? Разлічыце, у якім годзе колькасць насельніцтва будзе больш за 10 мільёнаў чалавек.

3. Якія наступствы для чалавецтва будзе мець павелічэнне тэмпаў роста насельніцтва? Абгрунтуйце свой адказ.

4. Складзіце графік змянення колькасці насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Запоўніце табліцу 18.

*Табліца 18*

**Насельніцтва Рэспублікі Беларусь**

| Год | Колькасць насельніцтва (тыс. чал.) | Прырост/Спад +/– |
|---|---|---|
| 1950 | 7709 | |
| 1980 | 9592 | |
| 1990 | 10 189 | |
| 2000 | 10 003 | |
| 2010 | 9500 | |
| 2018 | 9492 | |
| 2030 | | |
| 2040 | | |
| 2050 | | |

5. Складзіце табліцу «Насельніцтва маёй мясцовасці», якая павінна ўключаць калонкі з указаннем наступных параметраў:

- агульная колькасць насельніцтва (асобна указаць, колькі з іх мужчын і жанчын);
- колькасць насельніцтва, узрост якога больш за 80 гадоў;
- колькасць насельніцтва, занятага ў сферы вытворчасці;
- колькасць насельніцтва, занятага ў сельскай гаспадарцы;
- колькасць насельніцтва, занятага ў сферы паслуг.

6. Паразважайце, як зменіцца колькасць гарадскога і сельскага насельніцтва ў вашым рэгіёне ў 2050 годзе. Якія населеныя пункты вашай мясцовасці зніклі за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў? Якія знікнуць у бліжэйшыя 10 гадоў?

7. Якім вы бачыце свой населены пункт у 2050 годзе? Дапоўніце спіс прыметнікамі, якія характарызуюць ваш населены пункт у будучыні. Напрыклад, *зялёны, турыстычны, здаровы, добраўпарадкаваны, чысты, сучасны, гістарычны, прамысловы, дружалюбны, еўрапейскі…*

### Заданне 5

1. Знайдзіце інфармацыю пра гісторыю вашай установы адукацыі, падбярыце фотаздымкі.

2. Параўнайце знешні выгляд школьных падручнікаў першай паловы XX стагоддзя з сучаснымі падручнікамі (мал. 60–63). Якімі падручнікамі будуць карыстацца школьнікі праз 30 гадоў?








*Мал. 60–63.* Падручнікі і буквары: мінулае і сучаснасць

3. Які вучэбны прадмет можа з’явіцца ў школьным раскладзе? Абгрунтуйце неабходнасць ўвядзення новага прадмета. Якія тэмы будуць уключацца ў новы прадмет?

4. Падбярыце 5 школьных прылад, якімі карысталіся дзеці яшчэ 50 гадоў таму назад. Якія сучасныя школьныя прылады іх замянілі?

5. Падрыхтуйце невялікае паведамленне пра школу ў 2050 годзе па наступнай схеме:

- Якім будзе будынак школы?
- Вызначце тэрмін навучання ў ёй.
- Сплануйце рэжым работы школы.
- Якім будзе школьнае абсталяванне?
- Якія прадметы будуць выкладацца?
- Складзіце расклад заняткаў.
- Апішыце знешні выгляд вучняў.
- Прапануйце сваю сістэму ацэньвання.

**Заданне 6**

1. Прачытайце назвы прафесій, якія перасталі існаваць: *вяшчальнік, плытагон, ліхтаршчык, тэлефаніст, рамізнік, бурлак, чалавек-будзільнік, камінар, чысцільшчык абутку.*

Патлумачце, чым займаліся гэтыя людзі.

2. Складзіце топ-10 прафесій, якія сёння запатрабаваны у грамадстве. Якія прафесіі не будуць запатрабаваны праз 30 гадоў? Чым гэта абумоўлена? Абгрунтуйце свой адказ.

3. Прачытайце назвы прафесій і знайдзіце адпаведнае ім тлумачэнне (табл. 19).

*Табліца 19*

**Прафесіі будучыні**

| | |
|---|---|
| Анлайн-тэрапеўт | незалежны эксперт, які правярае экалагічнасць прадпрыемства і іншыя аб’екты інфраструктуры |
| Эксперт па вобразе будучыні вучня | спецыяліст, які вывучае змены ў эканоміцы, палітыцы, навуцы, культуры і грамадскім жыцці, а затым на аснове іх аналізу рыхтуе стратэгічныя рэкамендацыі для бізнэса |

| | |
|---|---|
| Экааўдытар | спецыяліст, які аналізуе і збірае даныя, каб затым на іх аснове рыхтаваць артыкулы, нататкі і іншыя фарматы журналісцкіх матэрыялаў |
| Гід у сферы касмічнага турызму | дапамагае школьнікам сфарміраваць персанальныя траекторыі развіцця; падбірае курсы, гурткі і секцыі згодна з іх інтарэсамі і здольнасцямі |
| Архітэктар зялёных гарадоў | спецыяліст па апрацоўцы даных на мовах, які стварае інструменты распазнавання тэксту і мовы, сістэм перакладу, галасавых асістэнтаў, разумных чат-ботаў |
| Трэндвотчар | спецыяліст па распрацоўцы і падборы праграм у космас, суправаджае турыстаў падчас падарожжа, праводзіць экскурсіі |
| Дата-журналіст | доктар, які вядзе папярэднюю дыягностыку пацыента, каб выявіць яго хваробу і адправіць да вузкага спецыяліста, а таксама праводзіць анлайн-кансультацыі падчас тэрапіі |
| Лічбавы лінгвіст | спецыяліст, які праектуе будынкі, кварталы і гарады з улікам экалагічных патрабаванняў і прынцыпаў ўстойлівага развіцця |
| Капірайтар | спецыяліст, які стварае тэкставы кантэнт |

### Заданне 7

Падбярыце ў разнастайных інфармацыйных крыніцах ілюстрацыі жылых дамоў незвычайнай архітэктуры, што могуць выкарыстоўвацца ў жыллёвым будаўніцтве ў будучым. Падрыхтуйце эскізы дамоў, дадаўшы ўласныя ідэі.

### Заданне 8

1. Прачытайце тэкст. Як паўплывае змена клімату на жыццядзейнасць чалавека праз 30 гадоў?

У апошнія гады клімат на Зямлі прыкметна змяняецца: адныя краіны пакутуюць ад анамальнай спякоты, іншыя — ад занадта суровых і снежных зім, нязвыклых для гэтых месцаў.

Эколагі гавораць пра глабальныя змены клімату, павелічэнне сярэдняй гадавой тэмпературы, якая выклікае раставанне леднікоў, павышэнне ўзроўню сусветнага акіяна. Акрамя пацяплення, адбываецца таксама разбалансіроўка ўсіх прыродных сістэм, што прыводзіць да змены рэжыму выпадзення ападкаў, тэмпературных анамалій і павелічэння экстрэмальных з'яў, такіх як ураганы, паводкі і засухі.

Па даных навукоўцаў, за дзесяць месяцаў 2015 г. сярэдняя тэмпература планеты павысілася на 1,02 °C, што вышэй за тую, якуюназіралі ў XIX ст. (менавіта ў гэты перыяд пачалі фіксаваць змены глабальнай тэмпературы). Парог у адзін градус быў перавышаны ўпершыню ў сучаснай гісторыі. Навукоўцы сыходзяцца ў меркаванні, што менавіта дзейнасць чалавека — спальванне нафты, газу і вугалю — прыводзіць да парніковага эфекту, які выклікае павышэнне сярэдняй тэмпературы на планеце. Эксперты адзначаюць, што ў перыяд паміж 2000 і 2010 гг. назіраўся самы магутны рост выкідаў парніковых газаў за апошнія 30 гадоў. Паводле звестак Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, у 2014 г. іх канцэнтрацыя ў атмасферы дасягнула рэкордна высокага ўзроўню.

Кліматычныя паясы зрушацца, змены надвор'я стануць больш рэзкімі. Некаторыя краіны з-за павышэння вільготнасці і высокай сярэдняй тэмпературы к 2100 г. могуць стаць непрыдатнымі для жыцця. Калі пацяпленне клімату не спыніць, многія экасістэмы, віды жывых істот, што ў іх уваходзяць, стануць менш разнастайнымі.

Эксперты ААН папярэджваюць, што пацяпленне адмоўна адаб'ецца і на ўраджайнасці, асабліва ў слабаразвітых краінах, што прывядзе да харчовых праблем. Іншым, надзвычай важным, наступствам кліматычных змяненняў у свеце можа стаць недахоп пітной вады *(Паводле tass.ru «Кліматычны хаус»)*.

2. Прапануйце свае варыянты кліматычнага прагнозу ў свеце.
3. Складзіце экалагічны прагноз па наступнай ілюстрацыі (мал. 64):



*Мал. 64.* Звалка электронікі Agbogbloshie у Заходняй Афрыцы

4. Карыстаючыся інфармацыяй з тэксту, вылічыце, якая тэмпература можа быць у Беларусі ў 2045 годзе, калі захаваецца тэндэнцыя пацяплення клімату.
5. Складзіце экалагічны прагноз развіцця вашага рэгіёна.

*Падагульненне*

— Якія з прапанаваных матэрыялаў з'яўляюцца найбольш інфарматыўнымі? Найбольш карыснымі для праекта?

**IV. Праектная дзейнасць.** Падрыхтоўка выставы «2050. Рэгіён вачамі дзяцей».

**V. Прэзентацыя праекта**. Матэрыялы выставы «2050. Рэгіён вачамі дзяцей» можна прэзентаваць у школьным музеі з адпаведнымі каментарыямі або паведамленнямі яго аўтараў.

**VI. Рэфлексія.**

- Што вам даў гэты праект?
- Якой вы бачыце будучыню Беларусі? Якой вы бачыце сваё жыццё і месца ў будучай Беларусі?
- Якія мы павінны рабіць намаганні для таго, каб беларусы адчувалі сябе шчаслівай нацыяй?

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Асветнікі зямлі Беларускай, X — пачатак XX ст.: энцыклапедычны даведнік / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. — 490 с.

2. Барадулін, Р. Збор твораў : у 5 т. / Р. Барадулін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1996–2002. — Т. 4 : Крытычныя артыкулы. Успаміны. Літаратурныя запісы. Вушацкі словазбор. — 2002. — 501 с.

3. Беларускі народны арнамент : альбом / Савет прамысловай кааперацыі БССР ; склалі : К. І. Паўлава [і інш.] ; адказны рэдактар В. Ф. Мацюшка ; уступны артыкул М. С. Кацара. — Мінск : [б. в.], 1953 (1955). — [137] л. : каляр. іл.

4. Броўка, Пятрусь. Збор твораў : у 9 т. / Пятрусь Броўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987–1992. — Т. 4 : Вершы, паэма, 1965–1972 / рэд. тома Т. К. Чабан. — 1989. — 590 с.

5. Бяздоннае багацце : легенды, паданні, сказы / склад. А. І. Гурскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990. — 255 с.

6. Бялявіна, В. М. Жаночы касцюм на Беларусі / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2007. — 351 с.

7. Ветрова, С. А. Повышение качества образования через формирование универсальных учебных действий учащихся : практ. пособие / С. А. Ветрова, М. М. Дударева. — Могилев : МГОИРО, 2020. — 42 с.

8. Вусная беларуская мова : хрэстаматыя / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск : Навука і тэхніка, 1990. — 269 с.

9. Галубок, У. Творы: Драматургія; Паэзія; Проза; Публіцыстыка / У. Галубок ; уклад., падрыхт. тэкстаў, уступ. арт. і камент. С. С. Лаўшука. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. — 607 с.

10. Гілевіч, Н. Родныя дзеці : раман у вершах ; паэмы / Н. Гілевіч. — Мінск : Беларускае таварыства «Кніга», 2001. — 442, [1] с., [2] л. іл. — (Народная бібліятэка).

11. Давідовіч, С. Ф. Збор твораў : у 5 т. / С. Давідовіч. — Мінск : Беларускі рэспубліканскі літаратурны фонд, 2016–2017. — Т. 1 : Вершы. Гумарэскі. — 2016. — 688 с.

12. Дома-медузы, космическая станция в Арктике и еще 5 городов будущего [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://realty.rbc.ru/news/5d1898d99a79477017180c79. — Дата доступу : 08.08.2023.

13. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы : уступныя артыкулы, даведачныя матэрыялы і каментарыі да карт / Р. І. Аванесаў [і інш.]. — Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1963. — 969 с.

14. Ельскі, А. Выбранае / А. Ельскі. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — 493 с., [4] л. іл. — (Беларускі кнігазбор. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).

15. Жабінская, М. П. Складзі ўзор сам = Составь узор сам : народны арнамент у побыце / М. П. Жабінская. — Мінск : Полымя, 1992. — 218, [2] с. : іл.

16. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха : аповесць / У. Караткевіч. — Мінск : Юнацтва, 1989. — 270 с.

17. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987–1991. — Т. 1. Вершы, паэмы. — 1987. — 431 с.

18. Климатический хаос. Чем грозит человечеству потепление, и что делать для предотвращения катастрофы [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://tass.ru/spec/climate. — Дата доступу : 08.08.2023.

19. Козел, В. И. Проектная деятельность для начинающих: равный обучает равного : практическое руководство / В. И. Козел, Е. А. Клещёва, А. Р. Дыкман. — Барановичи : БарГУ, 2022. — 65 с.

20. Колас, Якуб. Вершы ; Паэмы ; Апавяданні ; Аповесці ; Трылогія «На ростанях» : зб. / Якуб Колас. — Мінск : Харвест, 2012. — 1167 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

21. Колас, Якуб. Збор твораў у 20 т. / Якуб Колас. — Мінск : Беларуская навука, 2007–2012. — Т. 12 : Аповесці. — 2010. — 515 с.

22. Лужанін, Максім. Збор твораў : у 4 т. / Максім Лужанін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979–1981. — Т. 3 : Падарожныя нізкі ; Вершы, 1966–1973 ; Як нараджаўся новы свет ; Рэпартаж з рубцом на сэрцы. — 1981. — 511 с.

23. Маскевіч, А. Святы Юр'я, устань рана! / А. Маскевіч // Роднае слова. — 2012. — № 4. — С. 73–75.

24. Народная словатворчасць / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. — Мінск : Навука і тэхніка, 1979. — 333 с.

25. Несцярчук, Л. М. Палацы, паркі, замкі Баранавіцкага раёна: гісторыя, стан, перспектывы / Л. М. Несцярчук. — Брэст : Аблдрукарня, 1999. — 78 с. — (Архітэктурная спадчына Берасцейшчыны).

26. Организация проектной и исследовательской деятельности учащихся : материалы науч.-практ. конф. с междунар. участием, 20–22 апр. 2022 г. / редкол. : И. П. Кондратьева [и др.]. — Минск : Минский областной институт развития образования, 2022. — 253 с.

27. Памятники народной архитектуры и быта Белоруссии: методическое пособие по выявлению и собиранию / Белорусское добровольное общество охраны памятников истории и культуры. — Минск : Полымя, 1979. — 118 с.

28. Пасланні ад продкаў: пра што расказвае беларускі арнамент / склад. А. М. Коршак ; фота: А. П. Дрыбас [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2017. — 73, [6] с. : каляр. іл. — (Энцыклапедыя народнага майстра).

29. Помнікі этнаграфіі: методыка выяўлення, апісання і збірання / Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. — Мінск : Навука і тэхніка, 1981. — 149 с.

30. Проектная деятельность. Организация успешных мероприятий / сост. : И. А. Подило, А. В. Луговская. — Минск : Белорусский национальный технический университет, 2018. — 35 с.

31. Разанаў, А. Танец з вужакамі: Выбранае / А. Разанаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. — 461, [1] с. — (Беларуская проза XX стагоддзя).

32. Самосвалы БЕЛАЗ будут работать в пустыне Гоби [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.belta.by/economics/view/samosvaly-belaz-budut-rabotat-v-pustyne-gobi-404762-2020/. — Дата доступу : 08.08.2023.

33. Свиридов, А. Н. Социально-педагогическое проектирование : учеб. пособие / А. Н. Свиридов, Е. А. Шаталова, П. А. Шептенко. — Москва : Флинта, 2018. — 148 с. — (Педагогика).

34. Сіпакоў, Я. Зялёны лісток на планеце Зямля : эсэ / Я. Сіпакоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 277 с. — (Бібліятэка выбраных твораў).

35. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / уклад. Н. В. Гаўрош. — Мінск : Вышэйшая школа, 1998. — 603 с.

36. Создание и деятельность краеведческого клуба : практ. пособие / Главное управление по образованию Могилевского областного исполнительного комитета, Могилевский государственный областной институт развития образования. — Могилев : Могилевский государственный областной институт развития образования, 2020. — 26 с.

37. Таран, Р. И. Инновационный проект в школе: теоретические основы и опыт реализации / Р. И. Таран, Д. Ч. Покачайло. — Гродно : ГрГУ, 2020. — 169 с.

38. Холеў, С. Б. Да родных вытокаў : у дапамогу краязнаўцу / С. Б. Холеў. — Мінск : Народная асвета, 2019. —159 с.

39. Целяшук, В. Прафесіянал у пятым калене / В. Целяшук // Звязда. — 04.04.2014. — С. 6.

40. Чаропка, В. Ігнат Буйніцкі стварыў беларускі тэатр і памёр у танцы / В. Чаропка // Звязда. — 02.05.2022.

# Спіс малюнкаў

Мал. 1. Міхаіл Басалыга. «Мірскі замак» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://hvali.by/ngg_tag/mihail-basalyiga/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 2. Віктар Сташчанюк. «Дом, у якім жыў С. Манюшка ў Мінску» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://hvali.by/belorusskie-hudozhniki/viktor-stashhenyuk/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 3. Музей Максіма Багдановіча ў Гродна [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.holiday.by/by/skarb/866-muzej-maksima-bogdanovicha-v-grodno/dom. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 4. Ветраны млын у в. Мольча Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://svetlogorsk.by/ru/pages/svetlogorsk/history-cult/nikolin-ostrov/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 5. Музей творчасці «Бяздзежскі фартушок» (в. Бяздзеж) [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://vedaj.by/index.php/ru/goroda/brest/drogichin/bezdezh?hitcount=0?baiekfkngdjmoppp. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 6. Касцёл узвышэння св. Крыжа ў Гродна [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.radzima.org/ru/object-photo/6415.html). — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 7. Былы хіміка-фармацэўтычны завод у Партызанску (Расія) [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://kfss.ru/article/obnovleniya-36. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 8. Сядзіба Манюшкаў у Смілавічах [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://meridian28.com/report/smilovichy.html). — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 9. Сялянская сям'я на Палессі ў 1930-я гг. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://vitebsk.gov.by/by/gorod-by/view/akt-gistarychnaj-spravjadlivastsi-17-verasnja-belarus-adznachyts-novae-svjata-dzen-narodnaga-adzinstva-24179/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 10. Анатоль Капцюг. «Сялянская сядзіба ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://vilmuseum.by/services/classes/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 11. Анатоль Капцюг. «Сялянская хата пачатку XX стагоддзя (восень, вечар)» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://vilmuseum.by/services/classes/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 12. Аранчыцы. Схема сядзібы, 1939 // Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. — Мінск : БЕЛТА, 2002. — 336 с. : іл.

Мал. 13. Аранчыцы. План сядзібнага дома, 1838 // Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. — Мінск : БЕЛТА, 2002. — 336 с. : іл.

Мал. 44. Стары і хлопчык плятуць лапці. Палессе, 1936 [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://vitebsk.gov.by/by/gorod-by/view/akt-gistarychnaj-spravjadlivastsi-17-verasnja-belarus-adznachyts-novae-svjata-dzen-narodnaga-adzinstva-24179/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 45. Чатыры дзяўчыны ў строях. Мазырскі раён, в. Прудок, 1911. Фотаздымак з калекцыі Ісака Сербава [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://ethno.by/fotateka/767205311. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 46. Карта разнавіднасцей сялянскага строю [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://belfolk.nextohm.com/page-2/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 47. Міхась Раманюк падчас адной з экспедыцый па Беларусі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://ethno.by/persanalii/392110093. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 48. Міхась Раманюк. «Беларускія народныя строі» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://knihi.by/be/ramaniuk-michas-bielaruskija-narodnyja-stroji. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 50. Напалеон Орда. «Бяроза-Картузская» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://hvali.by/belorusskie-hudozhniki/napoleon-orda/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 51. Напалеон Орда. «Мірскі замак» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://hvali.by/belorusskie-hudozhniki/napoleon-orda/. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 52. Дажынкі ў Добрушы ў 2022 годзе [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.slova.by/ekonomika?start=32. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 54–57. Гарады будучыні [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://realty.rbc.ru/news/5d1898d99a79477017180c79. — Дата доступу : 11.10.2023.

Мал. 64. Звалка электронікі Agbogbloshie у Заходняй Афрыцы [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://glavmusor.ru/articles/samye-bolshie-svalki-v-mire/. — Дата доступу : 11.10.2023.